16+

# Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 31 (5240) 4 жніўня 2023 г.

ISSN 0024-4686



Кніжнае жыццё Брэстчыны
стар. 4—5




Дзе ўзрастаюць таленты?
стар. 6



Зорка падземнага свету
стар. 13

# У разгар «Ракуцёўскага лета»









Фотаздымкі Васіля Кулікова.

Юбілейны, 40-ы, раз Літаратурны музей Максіма Багдановіча сабраў сяброў і прыхільнікаў творчасці паэта на «Ракуцёўскае лета». Праграму свята паэзіі і песні ў філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры падрыхтавалі згодна з даўняй завядзёнкай: адбылася ўрачыстасць каля памятных камянёў, усе ахвотныя ўпершыню ці зноў прайшліся сцяжынамі каля фальварка, экскурсійнымі маршрутамі па музеі. Былі арганізаваны гульні, квесты, майстар-класы…

Але галоўная падзея свята — літаратурна-музычная імпрэза з удзелам паэтаў і дзеячаў культуры, фальклорных калектываў і эстрадных артыстаў. Вершы чыталі Міхась Пазнякоў, Навум Гальпяровіч, Віктар Шніп, Таццяна Атрошчанка, Алена Басікірская, Рагнед Малахоўскі і многія іншыя. За спевы і танцы адказвалі народны фальклорны ансамбль «Маркаўчанка», ансамбль народнай музыкі «Сакавінка», ансамбль народнай песні «Забудова», народны вакальны ансамбль «Беразіначка», фолк-бэнд «Неруш». Да таго ж падчас святочнай імпрэзы прайшло ўзнагароджанне пераможцаў творчага конкурсу «Ах, словы, чароўныя словы…».

## «ЛіМ»-акцэнты

**Адукацыя.** На заахвочванне адораных вучняў і студэнтаў, а таксама педагогаў, якія іх падрыхтавалі, накіравана больш як 370 тысяч рублёў са спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Адпаведнае рашэнне савета фонду зацверджана распараджэннем Кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі. Заахвочваннямі фонду адзначаны 52 пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў і алімпіяд, 32 педагагічныя і навуковыя работнікі. Акрамя таго, за асаблівыя поспехі ў вучобе, навукова-даследчай і творчай дзейнасці 187 студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі назначана стыпендыя Прэзідэнта Беларусі. Прыняцце распараджэння накіравана на выяўленне і падтрымку найбольш матываваных і адораных студэнтаў, стварэнне спрыяльных умоў для далейшага развіцця іх здольнасцей і паспяховай вучобы.

**Афіцыйна.** Міністр культуры Анатоль Маркевіч прадставіў калектыву нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» новага генеральнага дырэктара Юрыя Аляксея. «Кінавытворчасць заўсёды патрабуе крэатыўнага і незвычайнага падыходу ў тых пытаннях, якія цікавяць грамадства. Да фільмавытворчасці нельга ставіцца павярхоўна, таму што на мове добрай карціны можна дастукацца да гледача. Мы павінны перабудаваць сам фармат творчых узаемаадносін, таму што дзяржава падтрымлівае кінематаграфію, выдзяляючы бюджэтныя рэсурсы. Маладзёжная стужка, кінакамедыя або драма павінны несці ў сабе той элемент, які дасць магчымасць чалавеку задумацца аб важных рэчах. Трэба знайсці зразумелую мову для розных катэгорый гледачоў — ад дзяцей і да дарослых. У нас ёсць добрыя прыклады фільмаў», — заўважыў Анатоль Маркевіч. Кіраўнік ведамства падкрэсліў, што новаму генеральнаму дырэктару неабходна сканцэнтраваць увагу на фарміраванні каманды прафесіяналаў і аднадумцаў.

• Першы намеснік міністра культуры Валерый Грамада прадставіў супрацоўнікам дзяржаўнай установы «Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой"» новага кіраўніка. Ім стаў Аляксандр Каркатадзэ, які працуе ў мемарыяльным комплексе з 2003 года. 13 гадоў займаў пасаду загадчыка філіяла «Музей 5 форт», распрацаваў новы экскурсійны маршрут па Цярэспальскім умацаванні Брэсцкай крэпасці. «Сёння створаны ўсе ўмовы для творчай, натхнёнай працы па рэалізацыі перспектыўных планаў і канцэптуальнага развіцця ўстановы», — адзначыў Валерый Грамада і пажадаў новаму дырэктару праявіць сябе патрабавальным і мэтанакіраваным кіраўніком.

**Музей.** Адкрыццё часовай экспазіцыі «Для кожнай рэчы час ёсць свой…» адбудзецца заўтра ў мемарыяльнай сядзібе «Ласток» філіяла «Мікалаеўшчына» Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Сумесны з Беларускім дзяржаўным музеем народнай архітэктуры і побыту праект арганізаваны ў рамках святкавання II Гульняў краін СНД. Да 100-годдзя паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» была створана часовая экспазіцыя, якая пазнаёміць наведвальнікаў з такой важнай часткай матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, як традыцыйныя народныя святы. Між тым падчас адкрыцця экспазіцыі прагучаць беларускія народныя абрадавыя песні, урыўкі з паэмы «Новая зямля», адбудзецца куратарская экскурсія загадчыка навукова-экспазіцыйнага аддзела БДМНАіП Ігара Іванова.

• Выстаўка мастацкай фатаграфіі «Мазаіка ўражанняў» адкрылася ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. Праект арганізаваны ў рамках супрацоўніцтва Купалаўскага з Калінінградскім абласным гісторыка-мастацкім музеем і знаёміць з гісторыка-культурным ландшафтам самага заходняга рэгіёна Расіі. Выстаўка — вынік сумеснай работы супрацоўнікаў галоўнага гістарычнага музея Калінінградскай вобласці і фотамастака Эдуарда Малчанава. «Мазаіка ўражанняў», што адкрылася напярэдадні II Гульняў краін СНД, будзе працаваць да 11 верасня.

**Фестываль.** Гастранамічны і экалагічны фестываль «Палескі ўюн» пройдзе заўтра ў Пінскім раёне. Фэст, які адбудзецца другі раз, разгорнецца ў вёсцы Гарадзішча на базе эколага-турыстычнага комплексу «Цішыня». Гасцям прапануюць паўдзельнічаць у майстар-класах, наведаць выстаўку-кірмаш рамеснікаў і мастакоў, пакатацца на лодках і байдарках, прадэгуставаць палявую кухню. Будуць працаваць выязны гандаль, канатны гарадок, гульнявая зона. Забаўляць публіку будуць творчыя калектывы Пінска і Пінскага раёна, а таксама запрошаныя артысты. Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць ландшафтныя заказнікі рэспубліканскага значэння «Сярэдняя Прыпяць» і «Прастыр» і Пінскі райвыканкам.

**Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ**

стасункі

# У цэнтры ўвагі

**У дзяржаўнай установе «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінска» прайшла рабочая сустрэча кіраўніка пісьменніцкай арганізацыі Алеся Карлюкевіча з дырэктарам Аленай Мацвеевай.**

Размова ішла пра прыярытэтныя кірункі ў арганізацыі прапаганды кнігі. Алесь Карлюкевіч праінфармаваў кіраўніка сталічнай сеткі публічных бібліятэк пра навацыі ў рабоце творчай арганізацыі. Дамоўлена пра пашырэнне прэзентацыйнай работы ў 27 бібліятэках горада, асабліва ў частцы знаёмства з героіка-патрыятычнай літаратурай. Алесь Мікалаевіч нагадаў, што ў апошнія месяцы ў Выдавецкім доме «Звязда» выйшлі раман Мікалая Чаркашына «Брэсцкія вароты», дзе апавядаецца пра абарону Брэсцкай крэпасці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 годзе, зборнік «Твары Вялікай Перамогі». Увогуле, Вялікай Айчыннай вайне прысвечана нямала кніг гэтага выдавецтва — творы Мікалая Смірнова, Алены Харашэвіч, Уладзіміра Гаўрыловіча і іншых аўтараў.

Алена Мацвеева запрасіла пісьменнікаў больш актыўна вылучаць розныя навацыі. Прапанавала арганізаваць чытацкую прэмію лепшай кнізе, якая карыстаецца попытам у бібліятэках. У сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк горада Мінска склаліся добрыя сувязі з расійскімі літаратурнымі музеямі. Магчыма, гэтыя стасункі стануць таксама прадметам увагі беларускіх літаратараў. Чаму б не арганізаваць турыстычныя маршруты літаратурна-краязнаўчага характару, звязаныя з жыццём і творчасцю пісьменнікаў Расіі ў Беларусі? Добра было б ладзіць анлайн-сустрэчы з удзелам беларускіх і расійскіх пісьменнікаў на пляцоўках бібліятэк горада.

**Сяргей ШЫЧКО**

супрацоўніцтва

# Максім Багдановіч размаўляе па-кітайску

**У часопісе «Беларусь», які выходзіць на англійскай і беларускай мовах, ёсць раздзел з кітайскімі старонкамі. У ліпеньскім нумары выдання, якое для ўсяго свету прэзентуе нашу краіну, надрукаваны пераклады вершаў Максіма Багдановіча на кітайскую мову.**

Падборку твораў геніяльнага паэта («Раманс», «Першая любоў», «***Усё праходзе — і радасць, і мукі…», «Санет») пераўвасобіў на кітайскую мову прафесар Гу Юй. Гэта ўжо не першы зварот часопіса «Беларусь» да публікацыі твораў беларускіх паэтаў у перакладзе на кітайскую мову. Раней у выданні былі надрукаваны перастварэнні вершаў Якуба Коласа, Янкі Купалы. «Беларусь» з гэтымі публікацыямі патрапіла ва ўніверсітэты Пекіна і Шанхая, асобнікі часопіса перададзены ў фонды Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа ў Мінску.

Публікацыі Максіма Багдановіча на кітайскай мове ў ліпеньскім нумары часопіса «Беларусь» за 2023 год папярэднічае грунтоўны артыкул «Пясняр чыстай красы, альбо Максім Багдановіч па-кітайску». Зараз рыхтуюцца да друку пераклады паэтычных твораў Цёткі, Максіма Танка, Яўгеніі Янішчыц і іншых беларускіх паэтаў. Кітайскае прачытанне добра вядомых беларусам вершаў ажыццявіў Гу Юй, вядомы кітайскі перакладчык.

**Мікола БЕРЛЕЖ**

прэміі

# Кніга года. Іранскі фармат

**Тэгеран многія дзесяцігоддзі вядомы сваім стаўленнем да арганізацыі кнігавыдавецкай дзейнасці, правядзення кніжных форумаў. Адзін з творчых праектаў Ісламскай Рэспублікі Іран, які мае болей як 30-гадовую гісторыю, — Сусветная прэмія «Кніга года Ісламскай Рэспублікі Іран».**



Штогод Тэгеран запрашае выдавецтвы свету прадставіць на конкурс найлепшыя дасягненні за мінулы год. Вось і зараз прадаўжаецца збор навінак па выніках працы ў 2022 годзе. Пасольства рэспублікі заклікае да ўдзелу ў Сусветнай прэміі «Кніга года Ісламскай Рэспублікі Іран» і выдавецтвы Беларусі.

Варта заўважыць, што ў апошні час няблага развіваюцца беларуска-іранскія літаратурныя стасункі. Штогод Іран удзельнічае ў Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы. Летась у Выдавецкім доме «Звязда» быў выдадзены зборнік паэзіі Амара Хаяма ў перакладах на беларускую мову народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, Віктара Шніпа, Генадзя Аўласенкі. Зараз творчая каманда беларускіх перакладчыкаў працуе над пераўвасабленнем твораў класіка ўсходняй паэзіі Хафіза Шыразі (каля 1325—1389/1390), які нарадзіўся ў Шыразе (Іран). Лічыцца, што творчасць Хафіза ўяўляе сабой вышэйшае дасягненне сярэднявечнай лірыкі на мове фарсі.

**Кірыл ЛАДУЦЬКА**
**Фота Кастуся ДРОБАВА**

повязі

# «Легенда» ва Узбекістане

**Гістарычная аповесць Уладзіміра Караткевіча надрукавана ў Ташкенце ў перакладзе на ўзбекскую мову. Твор з'явіўся на старонках літаратурна-мастацкага часопіса «Шарк Юлдузі» («Звезда Востока).**

Перакладчыца караткевічаўскай аповесці — вядомая ўзбекская пісьменніца Рысалат Хайдарава. Пераклад спярша планаваўся да публікацыі ў часопісе «Жахон адабіёты» («Сусветная літаратура»), але ў выніку аповесць надрукавана ў «Шарк Юлдузі». У інтэрв'ю беларускім медыя некаторы час назад Р. Хайдарава заўважыла, што яе вельмі ўразілі ідэя, форма і стыль аповеду. Яна пераканана, што ўзбекскі чытач абавязкова павінен прачытаць гэты твор.

— У маіх планах і іншыя звароты да беларускай літаратуры з разлікам на пераклад найболей адметных яе твораў на ўзбекскую мову, — гаворыць Рысалат Хайдарава. — Першая сустрэча з Караткевічам ва ўзбекскага чытача адбылася ў 1962 годзе. Менавіта тады ў калектыўным зборніку беларускіх паэтаў з'явіліся пераклады двух яго вершаў, пераўвасобленыя на нашу мову легендарным Эркінам Вахідавым. Веру, што ў Ташкенце будзе выдадзена і асобная ўзбекская кніга класіка беларускай літаратуры.

**Кастусь ХАДЫКА**

анонсы

# Болей чым заўсёды

**Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк горада Мінска выступае асноўным арганізатарам Міжнароднай анлайн/афлайн канферэнцыі «Бібліятэка. Болей чым заўсёды», якая пройдзе ў Мінску 21 верасня.**

Да ўдзелу запрашаюцца спецыялісты бібліятэк, кніжных выдавецтваў, кнігагандлёвых арганізацый, устаноў навукі, культуры і адукацыі. З просьбай пракаментаваць падзею звярнуліся да кіраўніка Цэнтралізаванай сістэмы публічных бібліятэк сталіцы Алены Мацвеевай:

— Поруч з намі арганізатарамі канферэнцыі выступаюць упраўленне культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта і Беларуская бібліятэчная асацыяцыя. Інфармацыйную падтрымку забяспечвае Выдавецкі дом «Звязда». Асноўныя кірункі — «Адкрытая бібліятэка: новыя праекты і праграмы»; «Выкарыстанне анлайн-сэрвісаў як інструмент прыцягнення ўвагі да бібліятэкі»; «Аўтаматызаваныя інфармацыйныя бібліятэчныя сістэмы. Новыя магчымасці»; «Праекты па прасоўванні кнігі і чытання»; «Бібліятэка роўных магчымасцяў. Формы ўзаемадзеяння з карыстальнікамі з інваліднасцю»; «Выдавецкі і кніжны рынак — бібліятэкам». Да 25 жніўня прымаем даклады, рэгіструем удзельнікаў. Вельмі спадзяёмся на шырокі ўдзел і бібліятэкараў, выдаўцоў, гісторыкаў кнігі з розных краін. Ужо дакладна ведаем, што будуць выступаць калегі з Расійскай Федэрацыі, дарэчы, з самых розных рэгіёнаў, з Казахстана, Узбекістана, нават з Кітайскай Народнай Рэспублікі.

**Кастусь ЛЕШНІЦА**

з нагоды

# Мары, што сталі рэальнасцю

**Літаратурна-музычная імпрэза пад назвай «Анёл над Брэстам» адбылася на сцэне галоўнай пешаходнай вуліцы горада. Свята было прысвечана Дню горада — гэтай датай лічыцца 28 ліпеня, дзень вызвалення Брэста ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Арганізатарамі выступілі Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі і гарадская бібліятэка імя А.С. Пушкіна.**



*Спявае Мілана Дземідовіч.*

Любоў да роднага горада, павагу і бязмежную ўдзячнасць за шчаслівыя хвіліны жыцця выказвалі пісьменнікі, журналісты, неабыякавыя шчырыя грамадзяне. Адкрыла імпрэзу натхняльнай песняй Дар'я Садко, узнёслыя музычныя шэдэўры выканалі Мілана Дземідовіч і Лізавета Цупрык.

Таццяна Дземідовіч, Вера Вакула, Кацярына Мізерыя, Таццяна Шульга азнаёмілі гледачоў з уласнымі спробамі пяра. Вялікае пачынаецца з малога, і любоў да Радзімы пачынаецца з любові да таго месца, дзе ты нарадзіўся. Захапленне кутком, дзе ты пабачыў свет, харaством роднай прыроды, узнёслыя рамантычныя мары, разважанні над сэнсам патрыятычных пачуццяў — гэта былі асноўныя матывы іх вершаў.

Пра свае творы, дзе адлюстроўваецца гісторыя нашай краіны і горада Брэста, распавялі Зінаіда Дудзюк, Георгій Тамашэвіч, Анатоль Брытун.

Таццяна Дземідовіч звярнула асаблівую ўвагу на пераемнасць пакаленняў, праз якую старэйшым грамадзянам горада ўдалося злучыць мінулае з будучым. Так, яе бацькі ў маладосці, як і тысячы іх аднагодкаў, удзельнічалі ў аднаўленні горада пасля ваенных разбурэнняў разам са старэйшым пакаленнем, марылі пра тое, што Брэст стане прыгожым і ўтульным, — і дзякуючы гэтаму горад напоўніўся любоўю, добрымі справамі, харaством. Пісьменніца пажадала мірнага неба, сардэчнай чысціні і радасці кожнага дня.

**Аліса БРАТКА, фота аўтара**

# Пад мелодыі аркестра

**Падчас святкавання 79-й гадавіны вызвалення горада Брэста ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адбыўся Міжнародны парад аркестраў «Брэсцкая крэпасць». Ідэйным натхняльнікам парада выступіў Валерый Коваль, галоўны дырыжор Брэсцкага гарадскога духавога аркестра.**

Парад пачаўся 28 ліпеня на плошчы Леніна ў Брэсце з выступлення вайсковых аркестраў Рэспублікі Беларусь. У іх выкананні прагучалі песні часу Вялікай Айчыннай вайны, напрыклад «Катюша», а таксама папулярныя кампазіцыі: «Ягода-малина», «Летящей походкой», «Любовь окаянная» і іншыя. Таксама можна было пачуць папуры з песень вядомых савецкіх кампазітараў Аляксандра Зацэпіна і Эдуарда Арцем'ева.

29 ліпеня прайшло ўрачыстае адкрыццё парада аркестраў на плошчы. Яго наведалі прадстаўнікі ўлад горада і вобласці, у тым ліку старшыня Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта Сяргей Лабадзінскі. Пачаўся канцэрт з беларускага народнага танца «Лявоніха» ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра, завяршыўся ўрачыстым шэсцем удзельнікаў.

30 ліпеня ў МК «Брэсцкая крэпасць-герой» у прысутнасці старшыні Брэсцкага гарадскога савета дэпутатаў Мікалая Красоўскага, а таксама Святланы Сямашкі, кіраўніка аддзела культуры Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта, адбылося ўрачыстае закрыццё Міжнароднага парада аркестраў. Удзельнікі выступілі з творамі патрыятычнага характару.

**Святлана СЁМІНА**

ініцыятывы

# Шчырая зацікаўленасць

**Лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алеся Савіцкага (1924—2015) айчынны чытач добра ведае. Яго творы неаднаразова выходзілі і ў перакладзе на рускую мову. Пісьменнік — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, партызан, франтавік, адзначаны баявымі ўзнагародамі. Быў тройчы паранены. Дзяцінства, юныя гады жыцця, маладосць Алеся Ануфрыевіча прайшлі на Віцебшчыне, у Полацкім краі.**

Удзячныя землякі заснавалі Літаратурную прэмію імя Алеся Савіцкага. Арганізатар творчага праекта, які закліканы паўплываць на нараджэнне таленавітых твораў, — Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма. Заснаванне прэміі — прыклад шчырай увагі да беларускай мастацкай літаратуры.

Нагадаем, што ганаровы грамадзянін Полацка, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, лаўрэат Літаратурнай прэміі «Прохараўскае поле» (Расійская Федэрацыя) Алесь Савіцкі — аўтар кніг «Пасля паводкі», «Самы высокі паверх», «След пракладае першы», «Жанчына» і многіх іншых. У 1982 годзе пабачылі свет выбраныя творы Алеся Савіцкага ў двух тамах. Пісьменнік узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, Айчыннай вайны I ступені, Францыска Скарыны, медалямі.

**Раман СЭРВАЧ**

да ведама

# Людзі ў чорным

**Выдатныя дэкарацыі, дрэс-код *total-black* і непераможнае каханне зліліся ў пастаноўцы «Майстар і Маргарыта».**

Спецыяльна да юбілею заслужанай артысткі Беларусі Веры Паляковай-Макей у тэатры юнага гледача 19 і 20 ліпеня адбылася прэм'ера спектакля па матывах аднайменнага рамана Міхаіла Булгакава.

Сумесная работа Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача і праекта «ТрыТфармаТ» падарыла фантастычную казку 16+. Над ёй працавалі Таццяна Самбук у якасці аўтаркі інсцэніроўкі і рэжысёркі-пастаноўшчыцы, Дар'я Гарбузняк у ролі кампазітаркі і Наталля Лазарчык як мастачка па касцюмах.

— Паставілі за 1,5 месяца! Да гэтага была закулісная дзейнасць. Аднак з акцёрамі ўкладзіся ў такі тэрмін. Нам крыху не хапіла часу, і здавалася, што тэкст існуе асобна. Але магія тэатра заключаецца ў тым, што на сцэне ўсё становіцца на свае месцы, — падзялілася Таццяна Самбук.

Гісторыя пачынаецца з двух пытанняў: як вярнуцца ў момант сапраўднага шчасця і ці жывы той чалавек, з кім хочацца яго падзяліць? Не думаючы пра наступствы, Маргарыта гатовая развітацца з душой, каб даведацца адказы. Пастаноўка з акцэнтам на любоўную лінію гаворыць на немудрагелістай, даступнай большасці мове.

«Спектакль-перформанс, спектакль-канцэрт, спектакль-абсурд і драма. Ці можна даць яму вызначэнне? Нават не варта спрабаваць. Бо ён пра каханне», — абвяшчае афіша тэатра.

Перад прадстаўленнем у фае навучэнцы музычных устаноў Мінска выканалі класічныя творы, каб апранутыя ў чорнае наведвальнікі заглыбіліся ў атмасферу перформансу.

— Містыка павінна існаваць не толькі на сцэне, але і ў зале. Гледачы таксама ўдзельнікі спектакля, — адзначыла Таццяна Самбук.

**Паліна НІКАЛАІДЗІ**

«ЛіМ»-люстэрка

Мабільную экспазіцыю Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны плануюць прывезці ў верасні ў Калугу, інфармуе БелТА і спасылаецца на словы загадчыцы культурна-адукацыйнага аддзела Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Кацярыны Катлоўскай. «У Год гістарычнай памяці вялікі размах набыла патрыятычная акцыя "Дарога памяці", створаная на базе мабільнай экспазіцыі. Выязны музей працуе ўжо сёмы год. Але кожны раз мы робім акцэнт на пэўную дату. За ўвесь гэты час акцыя "Дарога памяці" праехала больш за 10 тысяч кіламетраў. З нашай мабільнай экспазіцыяй пазнаёміліся больш за 37 тысяч чалавек», — адзначыла Кацярына Катлоўская. Пры фарміраванні мабільнай экспазіцыі ў Год міру і стваральнай працы ўлічылі і юбілейныя даты: 80 гадоў перамогі ў Сталінградскай і Курскай бітвах, 80 гадоў перамогі ў бітве за Днепр. Цэлы раздзел (усяго ў экспазіцыі тры раздзелы) прысвечаны тэме вызвалення Беларусі.

Восем выканаўцаў прадставяць Беларусь на конкурсе маладзёжнай песні XVI Фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву», паведамляе БелТА са спасылкай на мастацкага кіраўніка — каардынатара ўдзельнікаў фестывалю ад Рэспублікі Беларусь Аляксандра Далжэўскага. Адборачны тур прайшоў у Маладзёжным тэатры эстрады. Кожны ўдзельнік прапанаваў дзве песні, адна з якіх раскрывала тэмы любові да Радзімы, роднага краю, подзвігу народа, а другая адлюстроўвала сучасныя маладзёжныя тэндэнцыі. Песні выконваліся на рускай і беларускай мовах. У выніку журы вызначыла прадстаўнікоў ад Беларусі. Гэта Ангеліна Васілеўская, Андрэй Кот, Ганна Варонка, Паліна Навіцкая, Эміль Хаспулатаў, Анастасія Бараноўская, Даніэла Цеплякова, Ася Карповіч. XVI Фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» адбудзецца з 5 да 9 верасня ў Смаленску.

Фонды Музея гісторыі горада Брэста папоўніліся дзесяццю алічбаванымі экзэмплярамі газеты «Наша Заря». Як тлумачыць БелТА, перадача нумароў газеты — падарунак да Дня горада і 25-гадовага юбілею музея. Праект быў арганізаваны дзякуючы намаганням Генеральнага консульства Расіі ў Брэсце і Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. «Для музейшчыкаў заўсёды вельмі важна і каштоўна мець сапраўдныя экзэмпляры, але не заўсёды ёсць такая магчымасць. Алічбаваныя газеты, можа быць, больш зручны варыянт. Людзям, якія захочуць іх прачытаць, мы дамо такую магчымасць. Вельмі цікавыя артыкулы», — расказала дырэктар Музея гісторыі горада Брэста Святлана Тамчук. «Наша Заря» ў Брэсце публікавалася ў канцы лета — пачатку восені 1912 года. Вядома, што выйшла ў свет усяго дзесяць нумароў.

Карціна брытанскага пейзажыста Джона Констэбла (1776—1837) была знойдзена ў 800-гадовым замку Краўфурдленд у графстве Эршыр у Шатландыі. Як удакладняе «ИТАР-ТАСС», кошт палатна папярэдне ацэньваецца ў 2,6 мільёна долараў. На карціне намаляваны мост праз раку, на раме пазначана імя Джона Констэбла і назва «Стары мост праз Эйван». Работа была набытая ў 1918 годзе і з таго часу вісела ў гасцявым крыле замка. Яго цяперашні ўладальнік Сайман Краўфурд аднёсці палатно ў аўкцыённы дом для ацэнкі 10 гадоў назад, але тады карціну палічылі падробкай. Джон Констэбл — брытанскі жывапісец-рамантык. Найбольшую вядомасць яму прынеслі пейзажы. На працягу жыцця ў Англіі Констэблу ўдалося прадаць усяго 12 карцін, а ў Францыі — у чатыры разы болей. Сярод найбольш вядомых работ мастака — «Воз для сена», «Сабор у Солсберы з ракі», «Дэдхемская даліна».

Венецыя і Венецыянская лагуна могуць быць уключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА пад пагрозай з-за ўплыву турызму і змены клімату. Паводле камюніке, павышэнне ўзроўню мора і іншыя прыродныя з'явы, звязаныя з глабальным пацяпленнем, пагражаюць цэласнасці аб'екта. Таксама ад Італіі просяць падаць вынікі даследаванняў з ацэнкай рызык, якія нясуць блізкія праходы круізных лайнераў і іншых буйных караблёў, і, магчыма, прыняць рашэнне аб пераводзе іх у больш аддаленыя парты. Занепакоенасць арганізацыі выклікаюць планы будаўніцтва ў горадзе і буйныя інфраструктурныя праекты паблізу ад яго. Таксама сярод негатыўных момантаў указваецца ўздзеянне турызму, у тым ліку шкода, якая наносіцца ў выніку пераабсталявання жылых дамоў для размяшчэння турыстаў або камерцыйнага выкарыстання. Падкрэслівaецца, што некаторыя з гэтых застарэлых праблем ужо выклікалі пагаршэнне ўласцівых Венецыі характарыстык, асабліва звязаных з яе культурнай і сацыяльнай ідэнтычнасцю і цэласнасцю.

**Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ**

# На кніжных

**Варта зайсці ў любую кніжную краму — і ты быццам трапляеш у казку: паўсюль з густам і замілаваннем расстаўлены выданні, здольныя задаволіць любы, нават самы строгі, патрабавальны густ. Прычым гаворка ідзе не толькі пра сталічныя магазіны, і ў гэтым пераканалася карэспандэнт «ЛіМа», пабываўшы ў Брэсце і ва ўсіх кніжных крамах горада. У склад «Брэсткнігі», рэгіянальнага філіяла Адкрытага акцыянернага таварыства «Белкніга», уваходзяць 14 кніжных крам, што знаходзяцца ў Брэсце і Брэсцкай вобласці. Як наладжана праца філіяла, чым кіруюцца кніжныя крамы пры прыняцці таго ці іншага рашэння? Пра гэта — сённяшняя гутарка з дырэктарам філіяла «Брэсткніга» Святланай Худзіцкай.**

## Святлана ХУДЗІЦКАЯ:

# «Руплівыя пчолкі, на якіх усё трымаецца...»

**— Святлана Іванаўна, раскажыце, калі ласка, як размеркаваны гандлёвыя ўстановы па вобласці?**

— Шэсць крам працуюць у Брэсце, тры крамы — у Баранавічах і столькі ж — у Пінску. Акрамя таго, ёсць крамка ў Іванава і павільён у Ганцавічах. І хоць плошчы нашы быццам і невялікія, але асартымент там вельмі добры, і наведвальнікі ідуць!



Фота Таццяны Шпакоўскай.

У Ганцавічах, дарэчы, павільён адчыніў свае дзверы перад пакупніком да Дня пісьменства ў 2011 годзе. На той час стала добрай традыцыяй пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі адкрываць новыя пункты продажу кніг перад кожным адпаведным святам, каб нагадаць, што кнігу мы любім, шануем і пашыраем. У 2018 годзе да Дня пісьменства адкрылася крамка і ў Іванава, на Палессі, — маленькая, але вельмі ўтульная. Яна была вельмі патрэбная жыхарам гарадка — дагэтуль на 16 тысяч насельніцтва там быў толькі прыватны кніжны гандаль і кіёскі друку. Натуральна, для зручнасці пакупнікоў хацелася б там мець і кніжную краму. Яна, дарэчы, была неабходная не толькі для іванаўцаў, але і для прыезджых — і з вобласці, і для турыстаў. Крама адразу ж стала карыстацца поспехам, прыносіць прыбытак. Там працуюць толькі тры чалавекі, але жанчыны тыя быццам адмыслова былі створаныя для кніжнага гандлю!

**— Невялікая колькасць супрацоўнікаў у кніжных крамах (даволі часта загадчыца ўстановы сама сядзіць за касай) — гэта тэндэнцыя апошніх гадоў ці так было заўсёды?**

— Дзесяцігоддзі таму штат быў большы, аднак цяпер час дыктуе адпаведныя ўмовы. Асабліва ў апошнія гады, калі была пандэмія і за кошт гэтага знізілася пакупніцкая здольнасць. Але адмыслова мы не праводзілі аптымізацыю ліку супрацоўнікаў — так склалася, што калектывы ў нас невялікія па колькасці. Нават у адной з найбольшых крам «Дружба», дзе аж два паверхі, працуе ўсяго 11 чалавек.

Увогуле нашы супрацоўнікі — як руплівыя пчолкі, на якіх усё трымаецца. У штаце зазвычай няма грузчыка — усю неабходную працу робяць прадаўцы: і разгружаюць, і прымаюць тавар, і разносяць на патрэбныя месцы, і ўводзяць у электронную сістэму, і ўносяць у гандлёвыя залы. Пасля — непасрэдна продаж і кансультаванне пакупніка. Вялікая заслуга нашых супрацоўнікаў у тым, што яны ўсе вельмі дасведчаныя і кваліфікаваныя. Калі чалавек вагаецца ў выбары выдання, заўжды могуць даць вычарпальную кансультацыю. Пры сучаснай канкурэнцыі, калі, напрыклад, у інтэрнэт-крамах *Oz.by* альбо ў прыватных прадпрымальнікаў кошты на кнігі могуць быць ніжэйшымі, гэта вельмі істотна. Хаця ёсць і кантынгент пакупнікоў, якія, атрымаўшы параду, дзякуюць і кажуць: «Добра, купім гэтае выданне там, дзе яно каштуе на 20 капеек танней…» Але ёсць і тыя, хто не глядзіць на кошт і набывае ўсё, што яму спадабаецца.

У любым выпадку, заўжды хочацца, каб пакупнік сышоў задаволены, таму ўсе супрацоўнікі крамы стараюцца дапамагчы, падказаць. А часам і папярэдзіць: маўляў, гэтая кніга толькі на гэты сезон, у хуткім часе будзе новае выданне, альбо наадварот: вось гэтыя дзве кнігі розных гадоў выдання, але змест у іх аднолькавы, а кошт у старэйшага выдання меншы…

Бывае, што на дадзены момант у нас няма кнігі, якую хочуць набыць, — тады мы замаўляем яе адмыслова для нашага пакупніка альбо правяраем па даведцы, дзе яна ёсць, і падказваем. Калі патрэбны падручнік, пакідаем пакупніку нашу візітку і раім пачакаць перавыдання.

Акрамя таго, цяпер у нас ёсць і інтэрнэт-гандаль. У нашым рэгіёне — у Брэсце ў краме «Дружба», у Пінску — у «Полымі» і ў баранавіцкіх «Кнігах» ёсць аддзелы «Кніга — поштай»: калі кнігу замаўляюць, высылаем яе па пошце, як было некалі ў савецкія часы…

**— А што за людзі ў вас працуюць?**

— Калектывы ў нас цудоўныя! Стараюцца ўсе: ад загадчыцы да прыбіральшчыцы. Прыбіральшчыцы, дарэчы, могуць пракансультаваць наведвальніка на ўзроўні прадаўца — працуюць яны даўно і любяць чытаць. Могуць падказаць, дзе якія выданні знаходзяцца, і дапамагчы вынесці кнігу, паставіць на належнае месца. Калектывы дружныя, таму што ўсе разумеюць: ад таго, што здолеем прадаць, залежыць фінансавы вынік і наш дабрабыт.

Мы ў сваю чаргу стымулюем, заахвочваем да добрай працы. Так, у нас унутраны гаспадарчы разлік — вынік выводзіцца штомесяц па кожнай краме. І ў залежнасці ад даходу прымяняюцца свае працэнты пры прэміраванні. А кожнаму ж хочацца атрымаць прэмію больш, таму зладжана працуюць усе, незалежна ад пасады. Таваразнаўца, напрыклад, нягледзячы на тое, што асноўная яго задача — замовіць кнігі, удзельнічае ва ўсіх працэсах: можа і даць кансультацыю, і папрацаваць на касе. Такім чынам, галоўнае багацце і нашага рэгіёна, і нашага кніжнага гандлю — людзі, кампетэнтныя спецыялісты. Нічога не было б без такіх калектываў…

**— Стараецеся задаволіць пакупніка, каб ён звяртаўся да вас заўжды, падстройваецеся, каб адпавядаць зменам у гандлёвай сістэме?**

— Так, бо цяпер такі час, калі ўсе хочуць знайсці найлепшае, але каб кошт быў не самы высокі. Часткова продаж у нас ажыццяўляецца па безнаяўным разліку. Нам хацелася б, каб па безнаяўным разліку ў нас бралі кніг і папяровай прадукцыі больш, але ж цяпер паўсюль тэндар, цэнавы фактар — кліенты маюць шырокі выбар. Дзяржаўныя прадпрыемствы, якія працуюць праз казначэйствы, павінны прытрымлівацца яшчэ больш складанай працэдуры…

**— А ў чым спецыфіка кніжнага гандлю ў вашым рэгіёне?**

— У Брэсце, напрыклад, усе кніжныя крамы знаходзяцца ў цэнтры. У Баранавічах таксама: адна — на плошчы і дзве — недалёка, па абодва бакі. У Пінску — адна на плошчы, іншая — на суседняй вуліцы, і яшчэ адна — амаль на выездзе. У Іванава таксама ў цэнтры, арандаванае памяшканне ва ўнівермагу, дзе ўваход праз сумежную краму «Востраў чысціні». Крама надзвычай яркая, вясёлая, дзеці прыходзяць туды з асаблівым задавальненнем! Дый у дарослых ад яркасці фарбаў нават настрой уздымаецца.

Але хацелася б, каб крамы нашы былі яшчэ лепшыя. Ёсць патрэба зрабіць рамонт і ў адной краме, і ў іншай, паставіць новае абсталяванне. Пару гадоў таму ў адной з крам памянялі столь, зрабілі на сучасны лад — падвесную, — і пакупнікі былі ў захапленні! Казалі: «У вас нават памяшканне большым стала! Што вы пашырылі?» А мы ўсяго толькі памянялі столь і асвятленне — прастора быццам ажыла, зайграла адценнямі! Хочацца і надалей ва ўсім паляпшацца.

**— Што дапамагае вам быць цікавымі і для сябе, і для пакупніка?**

— Мы не замыкаемся толькі на адным відзе дзейнасці. Напрыклад, увесну да 9 Мая «Белкніга» праводзіла конкурс чытальнікаў «Жывое слова Вялікай Перамогі». Да ўдзелу запрашаліся і дзеці, і дарослыя, — трэба было пачытаць верш. Спачатку супрацоўнікі былі насцярожаныя, думалі: гэта ж трэба быць прафесіяналамі, куды нам… А потым пачалі паціху спрабаваць! Так, прадавец у Баранавічах паспрабавала агучыць «Варварства» Мусы Джаліля — і так здолела прачытаць, што аж мурашкі па скуры беглі! Калі чуеш такое, зусім па-іншаму пачынаеш думаць і аб чалавеку, і аб краме, дзе ён працуе! А ў «Дружбе» прадавец чытала пра Брэсцкую крэпасць — «Бессмяротны гарнізон». Знялі ролік у краме — атрымалася цудоўна! Па выніках баранавіцкі «Кніжны свет» заняў 1-е месца, а «Дружба» — 3-е. Наколькі я ганарылася сваімі супрацоўнікамі! Бралі ўдзел і дзеці — так, у Баранавічах чытала ўнучка нашай загадчыцы. Адмыслова яна не рыхтавалася, пачытала, як умела. А атрымалася добра, яе адзначылі.



Фота Таццяны Дзямідовіч.

*Батлейка ў кніжнай краме «Іскра».*

**— У гандлёвых устаноў не можа не быць канкурэнтаў. Ці шмат іх у вас?**

— Натуральна! Па-першае, гэта *Oz.by*. Па-другое, прыватныя прадпрымальнікі, што асабліва моцную канкурэнцыю складаюць у сезон падрыхтоўкі школьнай літаратуры.

Але не скажу, каб канкурэнты вельмі нам заміналі. Мо так і трэба — мы ж не павінны быць манапалістамі! Як бы там ні было, ніхто не дае такі шырокі асартымент, як «Белкніга». *Oz.by* працуе як інтэрнэт-гандаль — гэты напрамак наладжаны там найлепш. Яны і пачыналі шмат гадоў таму як інтэрнэт-крама. У нас жа гэты напрамак толькі набірае абароты. Магчыма, за ім — будучыня. Але лічу, што ў нас больш кваліфікаваныя супрацоўнікі. Калі замаўляеш кнігу на *Oz.by*, нічога пра яе не ведаючы, можаш карыстацца толькі невялікай анатацыяй, якая на тое і разлічана, каб

БЕЛКНІГА

# Адчыніце дзверы крамы




*Фота Тацы Шпакоўскай.*

*Узнагароды, атрыманыя кніжнымі крамамі Брэста.*

ты купіў выданне, і не заўжды адпавядае сапраўднасці. У нас жа пра кнігу табе раскажуць усё.

Але ўвогуле хочацца, каб кніжны гандаль быў прывабным, каб нам заўжды ішлі насустрач і давалі больш ільгот… Хаця гэта толькі мары. І так нам дапамагаюць: напрыклад, у крамах, дзе кнігі займаюць больш чым 50 адсоткаў гандлёвых паліц, ёсць паніжальны каэфіцыент па арэндзе — для нас гэта вялікі плюс, арандаваных памяшканняў маем шмат.

**— Якое месца ў рабоце «Белкнігі» займаюць бібліятэкі?**

— Раней, калі ў нас быў уласны склад, мы працавалі з бібліятэкамі непасрэдна. Цяпер з бібліятэкамі больш працуе галоўная арганізацыя «Белкнігі» — там ёсць аптовы аддзел, у нас жа засталіся толькі гандлёвыя пункты. Акрамя таго, да бібліятэк прад'яўляюць свае патрабаванні. Так, пастаўка кніг павінна адбыцца па тэндары. Бібліятэкам выгадна набываць выданні наўпрост з выдавецтваў, таму што ў нас існуе нацэнка, за кошт якой мы ажыццяўляем сваю дзейнасць. З намі бібліятэкі могуць супрацоўнічаць, як і ўсе іншыя: прыйсці, выбраць кнігі і аплаціць па безнаяўным разліку.

**— Ці існуе ў рэгіёне асаблівы попыт на літаратуру пра Брэст?**

— Так, і таму шмат адпаведнай літаратуры выходзіць з друку пад дахам «Вячэрняга Брэста»: паштоўкі, буклеты. Ёсць яшчэ брэсцкае прадпрыемства «Паліграфіка» — яно надае шмат увагі выпуску краязнаўчай літаратуры, а таксама «Альтэрнатыва». Цікавасця і мясцовыя жыхары, але асабліва запатрабавана літаратура пра Брэст і Брэстчыну ў турыстаў.

**— А што наконт выданняў мясцовых пісьменнікаў?**

— Супрацоўнічаем і з аўтарамі: яны прыносяць нам уласныя кнігі, мы заключаем з імі дамову, пасля выданні паступаюць у крамы, дзе сумесна праводзім прэзентацыі. Заўжды ідзём насустрач, удзельнічаем у імпрэзах, запрашаем школьнікаў: дзеці актыўна выступаюць і атрымліваюць ад нас прызы — адбываецца сапраўднае свята кнігі, дзеці выходзяць шчаслівыя! На сёлетнім свяце роднай мовы школьнікі арганізавалі батлейку па творы жабінкаўскага аўтара Расціслава Бензерука, было надзвычай цікава.

**— Наколькі была патрэбная рэарганізацыя ў 2011 годзе, аб'яднанне ўсіх прадпрыемстваў па продажы кніг пад адным дахам?**

— Час дыктаваў гэтую неабходнасць. Палічылі мэтазгодным папулярызаваць і прапагандаваць кнігу менавіта так — каб не кожны заяўляў пра сябе, а рабіць гэта разам. Чым ты большы, тым гучней ты можаш пра сябе сказаць. Таму пачынаючы з 2011 года мы моцна зрасліся з галоўнай арганізацыяй, нічым не пакрыўджаны, своечасова робіцца рамонты, а крамы нашы знаходзяцца ў дзясятцы лепшых па рэспубліцы — адчуваеш радасць за тое, што цябе заўважылі і адзначылі. Па вялікім рахунку, змянілася толькі назва.

**— Раскажыце пра ваш шлях у прафесію.**

— Усё складалася на карысць кнігі з самага дзяцінства. У чатыры гады навучылася чытаць побач са старэйшым братам. Бацькі адвялі мяне ў бібліятэку, і калі пачала ўсведамляць, што гэта такое, мне падалося, што кніжніца — найлепшае месца на зямлі, а бібліятэкары — найцудоўнейшыя людзі, у якіх самая выдатная праца. Я пачала марыць пра тое, што сама буду працаваць у бібліятэцы — буду заўжды чытаць кнігі! Потым, у школьныя гады, зацікавілася і матэматыкай, але праца з кнігай была наканаванай. Бо пасля сканчэння інстытута народнай гаспадаркі мяне размеркавалі менавіта ў кніжны гандаль! І як прыйшла ў гэтую галіну пасля ВНУ, так больш за трыццаць гадоў у ёй і працую. Атрымліваецца, што мары спраўджваюцца, толькі трэба вельмі хацець! Так і чытаю кнігі…

**Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ**

## «Ветразь»




Кніжная крама «Ветразь» — найбліжэйшая да чыгункі, і гэта найбольш спрыяльнае месца для наведвання гасцямі горада. Турыстаў прыходзіць шмат: і па сувеніры, і па дзіцячыя кніжачкі, у тым ліку на беларускай мове. Карыстаецца папулярнасцю крама і ў моладзі. Кнігі брэсцкіх аўтараў, а таксама выданні пра Брэстчыну прадстаўлены тут на відным месцы. Шырокі асартымент і школьнай, вучэбнай літаратуры.

— Калі раптам не хапае якога-небудзь дапаможніка, мы бяжым сюды, — дзеліцца старшыня Брэсцкага аддзялення Саюза пісьменнікаў Таццяна Дзямідовіч. — Хацелася б толькі, каб было больш кніг брэсцкіх аўтараў па-беларуску. Тут назіраецца дэфіцыт…

— Сярод найбольш запатрабаваных аўтараў — Уладзімір Караткевіч і Васіль Быкаў, — распавядае загадчыца крамы Ірына Стасевіч. — Запатрабаваны і выданні з букіністычнага аддзела: яны адносна недарагія, таму людзі часта набываюць нешта пачытаць у дарозе. Ёсць кола пастаянных кліентаў, якія здаюць кнігі на рэалізацыю.

Крама гэтая адна з найстарэйшых, вядзе свой адлік з 1959 года.

## «Іскра»

Кампактненькае, але ўтульнае памяшканне кніжнай крамы «Іскра» сустракае наведвальніка паліцай з выданнямі аўтараў Брэстчыны: Зінаіды Дудзюк, Наталлі Кандрашук, Анастасіі Смілінай, Настассі Нарэйкі, Любові Красеўскай. Шырока прадстаўлена і «Берасцейская скарбніца». З задавальненнем прыходзяць сюды дзеці. Так, на маштабным свяце да Дня беларускай мовы тут выступалі маладыя аўтары Ірына Макарчук і Кацярына Мізерыя, а вучні сярэдняй школы № 9 падрыхтавалі адмысловую праграму, на якой выступалі ў нацыянальных касцюмах, атрымалі ад «Белкнігі» падарункі.




— Калі мы праводзім імпрэзы, стараемся падключыць і выпадковых наведвальнікаў, асабліва калі яны з дзецьмі: каб малыя штосьці прачыталі, адказалі на пытанні, размаўлялі на роднай мове, — дзеліцца Таццяна Дзямідовіч. — Пісьменнікаў тут ведаюць у твар і па імені, яны тут частыя госці.

Нядаўна крама адзначыла 55-гадовы юбілей.

## «Дружба»

Крама адчынілася ў 1981 годзе. Спачатку там прадавалася ў асноўным замежная літаратура. Крама гэтая — адна з узорных, уваходзіць у дзясятку найлепшых па рэспубліцы. Часта там праводзяцца мерапрыемствы з удзелам пісьменнікаў Брэстчыны.

Пакупнік зазвычай хоча зайсці ў краму і купіць усё патрэбнае і адразу. Крама «Дружба» якраз і адпавядае гэтым патрабаванням: па асартыменце яна, бадай, у горадзе найшырэйшая, мае два паверхі.




*Інтэрактыўная зона паміж паверхамі.*

Дарэчы, паміж паверхамі ў краме ёсць інтэрактыўная пляцоўка, дзе заўжды цікава затрымацца дзіцяці: тут знаходзяцца вялікі «ручны» каляндар і героі папулярных твораў, а таксама «дрэва знічак». Гэта адмысловая фотазона, дзе любы можа сфатаграфавацца на памяць. Праект гэты спрыяў таму, што крама заняла першае месца ў прыгожванні да Новага года. Усё гэта — задумы супрацоўнікаў крамы, тое, што яны робяць сваімі рукамі.

## «Мастацтва»

Гэтая крама таксама адна з гістарычных: нядаўна адзначалі 60-годдзе ўстановы. Калектыў складае ўсяго тры чалавекі, але якія яны крэатыўныя! Робяць цудоўныя ўпрыгожванні да святаў: і афармленне вітрын, і роспіс вокнаў, і выцінанкі!

Усё лепшае тут на першым плане. Асаблівая ўвага — прадукцыі беларускіх выдавецтваў. Ёсць у крамцы і букіністычны аддзел, і асобны закутак, дзе прадаюцца канцтавары і тое, што патрэбна школьніку. Часта сюды прыходзяць і аматары дэтэктыўнага рамана і




*Таццяна Дзямідовіч з выданнямі аўтараў Брэстчыны.*

містыкі, і тыя, хто «палюе» за рэдкай кнігай, зборамі твораў, выдадзенымі ад паўстагоддзя таму і болей, і па адмысловы сувенір са згадкай аб Брэстчыне.

— Пры ўваходзе ў кніжную краму кажуць: адчыніце дзверы, разгарніце кнігу і адкрыйце сэрца, — нагадвае Святлана Худзіцкая, дырэктар брэсцкага аддзялення «Белкнігі», — там — адказы на любое пытанне. А як часта можна назіраць карціну, калі з дарослымі прыходзіць у краму дзіця і, пакуль тыя вырашаюць свае пытанні, бярэ ўпадабаную кнігу, знаходзіць зручнае месца, а то і ледзь не на падлогу можа сесці, і гартае, чытае выданне, пра ўсё забыўшыся! Душа радуецца!

Зусім не наўмысна рэальнасць кніжнай крамы прадэманстравала сітуацыю, пра якую толькі што распавядалі. Мама з маленькімі дзяўчаткамі выбірала штосьці для старэйшай. Малодшая таксама знайшла сабе цікавы занятак: пацягнула з паліцы і разгарнула дзіцячую кніжачку...

## «Асвета»



Як і «Дружба», гэтая крама ўваходзіць у дзясятку тых устаноў, што з'яўляюцца аб'ектамі гонару брэсцкага філіяла «Белкнігі». Святлана Худзіцкая звяртае ўвагу на тое, што ў апошнія гады асабліва моладзь цікавіцца выданнямі па псіхалогіі і філасофіі. Крама мае шырокі асартымент адпаведнай літаратуры, а таксама выданняў на самыя розныя тэмы, навуковых і навукова-папулярных.

Шпацыр па крамах атрымаўся цікавым, насычаным. Асабліва парадаваў пазітыўны настрой і супрацоўнікаў устаноў, і спадарожнікаў, якія зрабілі для чытачоў «ЛіМа» невялічкую экскурсію. Па дарозе жартавалі, успаміналі розныя гісторыі, звязаныя з кнігамі, — і з уласнага жыцця, і тыя, што калісьці назіралі ў краме. Так, жанчыны згадвалі, які смешны выпадак аднойчы адбыўся ў адной з рэгіянальных кніжных крам: завітаў выкшталцона, модна апрануты мужчына, падобны да бізнесмена, і папрасіў «Рашэбнік» па матэматыцы для 1-га класа, а калі ў яго спыталі, няўжо ён сам не ў стане рашыць простыя задачкі, сумеўся і не ведаў, што адказаць…

**Таша ШПАКОЎСКАЯ, фота аўтара**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

# Разыначка ў разнастайнасці

**Сёмы нумар «Маладосці» прадстаўляе шырокую геаграфію паэзіі і прозы як маладых аўтараў, уключаючы лаўрэатаў конкурсу «БрамаМар», так і аўтарытэтных сучаснікаў. Традыцыйная рубрыка «Пераклады» працягвае публікацыю твораў Эдгара Алана По. У рубрыцы «Асоба» чытача чакае шчырае інтэрв'ю з Таццянай Пташнікавай, у «Мастацтве» пра творчы лёс жывапісца Юзафа Аляшкевіча распавядае Вітаўт Чаропка, а Ксенія Зарэцкая прапануе тур у сталічны Маладзёжны тэатр на… балет! Рэцэнзіі на свежыя выданні ад Ангеліны Данцовай і Валерыя Максімовіча — у «Літаратурным свеце», а сакрэты майстэрства празаіка ад Алеся Бычкоўскага — у рубрыцы «Як я пішу».**

## Малая проза. Эсэ. Раман

Арына Пранікава ў апавяданні «Ваўкі і зайцы» інтэрпрэтуе сюжэт еўрапейскай казкі аб Чырвоным Каптурку, вядомы, бадай, з Сярэднявечча, адкрыты для чытача Шарлем Перо і братамі Грым, пашыраны ў перакладах на славянскія мовы. Аўтарка перапрацоўвае гісторыю знакамітай гераіні, дапісваючы псіхалагічны стан і цялесныя адчуванні падчас вандроўкі, якая планавалася бяспечнай. Дзея ў духу «Караліны» Ніла Геймана, на мяжы рэальнага і фантастычнага, толькі, відаць, без павучальнага наратыву; карціны, што паўстаюць пры чытанні, — нібы калаж, складзены з настрыжанай раскадроўкі кінахарару. Не ўсе зайцы добрыя, не ўсе ваўкі злосныя, а ты і сам не ведаеш, як можаш уратаваць мінака ў дарозе.

Ганна Глінская распавядае пра нязбытную мару звычайнай жанчыны, крылы якой зламалі жыццёвыя абставіны. Тэкст аздоблены апісаннямі гарадскіх пейзажаў і інтэр'ераў, якія лёгка візуалізуюцца, багаты на асобныя дэталі, што дапаўняюць характаралагічныя рысы персанажаў.

Паліна Дваранская ў апавяданні «Чужы шлях да свайго шчасця» стварае меладраматычны сюжэт, дзе ў цэнтры — лёс мэтанакіраванай дзяўчыны, якая павінна здрадзіць сваёй мары дзеля жыцця каханага чалавека. Час паказвае, што нічога не адбываецца дарэмна. Маладая пісьменніца змушае нас паверыць, што справядлівасць (рана ці позна) павінна запанаваць, нават калі людзі не могуць своечасова выказаць свае пачуцці.

Рэдактар «Мастацкай літаратуры» Аліна Анцытовіч у сваім эсэ зачароўвае ўражаннямі ад казачнага поля льну, разважае аб плыннасці часу і непазбежнасці прыродных з'яў, якія здольныя натхніць творцу сваёй чароўнай музыкай — ці то мелодыямі ветру, які гуляе сцяблінкамі на льняным полі, ці то аркестрам пчол, якія збіраюць нектар, ці то звонам спелых галовак льну. І згадаць народную песню падчас попрадак вясковых жанчын доўгім зімовым вечарам.

У сёмым нумары «Маладосці» апублікаваны завяршальныя часткі гістарычнага рамана Зінаіды Дудзюк «Сыны Рарога» (першыя тры фрагменты можна знайсці ў №№ 4, 5, 6). Падзеі, пра якія ідзе гаворка, звязаны з заходнеславянскімі плямёнамі палабаў, у прыватнасці рарогаў-абадрытаў, на берагах ракі Эльбы ў канцы VIII — пачатку IX стагоддзя нашай эры. У апошняй частцы рамана чытач даведаецца, якім чынам завяршылася панаванне роду князя рарогаў-абадрытаў Дражкі і які быў наступны лёс плямёнаў палабаў на фоне падзей таго часу ў Еўропе.

*«Праўду з няпраўдай,*
*Цноту з гарэзіяй*
*Вымешай спрытам, —*
*Будзе паэзія».*
*Янка Купала (1906)*

Анастасія Швядко сабрала ў нізцы вершы, напоўненыя светлым сумам па маленстве, па малой радзіме, а побач — развагі пра лёс і каханне. У творах Леры Гілеўскай апошняе на першым месцы. Два тэксты Андрэя Дарожкіна: адзін — пра сталенне, другі — пра пачулае каханне, якое паўстае на мяжы з пазбяганнем, але жыве цягам доўгага часу. Павіншуем маладзейшых паэтаў з публікацыямі і пажадаем не спыняцца на дасягненнях і практыкавацца ў новых формах.

Старэйшае пакаленне прадстаўляе ў паэзіі Уладзімір Мароз, які апавядае і пра сардэчныя пачуцці, і ўзнёсла пра фізічнае, звязанае з імі. Побач — філасафічнае. Аўтар апелюе і да хрысціянскай сімволікі, толькі ў сучаснай беларускай прасторы — крыж, скрыжалі, райскі сад паўстаюць сярод родных пейзажаў. Кожны паэт нясе свой сэнс у творы. Ці кожны сэнс улоўны чытачу, ці чытач адчувае закладзеныя сэнсы, а то і надбудоўвае свае ўласныя да паэтавых… Адчуваецца: нізка «Недзе квітнеючы сад…» Уладзіміра Мароза скіраваная замарудзіць час свайго рэцыпіента, нібы нагадвае яму, што варта спыніцца і заўважаць дэталі, вяртацца ва ўспаміны. Так аўтар прапануе згадаць першы баравік: «Ціха крочыш, пакуль не баішся нідзе заблудзіцца, — // І адкрыецца раптам пад хвойкай табе баравік! // Першы, першы і твой! — Як знаходкай цяпер наталіцца? // Тут да месца дзіцячы адкрыты і радасны крык». Зловім да ўсяго сказанага вышэй (наўмысную ці не) адсылку ў нізцы да рамана Мілана Кундэры «Невыносная лёгкасць быцця».

На мяжы прозы і паэзіі — надзвычай афарыстычныя і ёмістыя мініяцюры Змітрака Марозава. Аўтар разважае на шэраг тэм, што хвалююць яго самога і, верагодна, шмат каму адгукнуцца: экзістэнцыйныя пытанні, роля творцы і творчасці, выхаванне чалавечнасці ва ўсіх яе праявах: «Можна прачытаць дзясяткі тамоў класічнай літаратуры. Можна гадзінамі разважаць аб духоўнасці — і разам з гэтым не адчуваць боль суседа, брата, маці. Відаць, таямнічая сутнасць чалавечай душы ў тым, наколькі глыбока яна ўспрымае не толькі прачытанае, але і перажытае». Публікацыя распачынаецца з выслоўя Жоржы Амаду, а спрэс у тэксце Змітрок Марозаў звяртаецца да спадчыны і іншых знакавых для сябе постацей, такіх як доктар Святаслаў Фёдараў, філосаф Мікалай Бярдзяеў, пісьменнікі Джэк Лондан, Максім Горкі, Мікалай Някрасаў, Леанід Галубовіч і іншыя.

Памяць Ізяслава Катлярова ўшанавана ў публікацыі ўрыўка «Тураўскі замак» з летапіснай паэмы «Замкавы час Беларусі». На вялікі жаль, пісьменніка, журналіста, перакладчыка, аўтара шэрагу кніг паэзіі і матэрыялаў у літаратурных выданнях Беларусі і па-за яе межамі, ганаровага грамадзяніна горада Светлагорска не стала 26 чэрвеня… Той, хто хоць раз быў у старажытным Тураве, пэўна, пазнае яго ў радках:

*Я хадзіў тут, дзе дол повен моцы,*
*рэк, рачулак зіхценне ўбіраў.*
*Горад, што існуе нібы ў вёсцы,*
*легендарна і я адчуваў.*
*Дух Сусвету лунаў нада мною,*
*крокі доўжылі рэха эпох,*
*і нябеснасцю, ўсё-ткі зямною,*
*ўвасабляцца мой кожны дзень мог.*
*Летапісец меў рацыю, пэўна,*
*слаўны Нестар — яго мне ізноў*
*скажа іменем Тура пра гэта*
*і «Аповесць мінулых часоў».*

У рубрыцы «Пераклад» — працяг плённага супрацоўніцтва часопіса «Маладосць» з Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэтам. Казка з алегарычным зместам Эдгара Алана




По «Кароль Чума» ў перастварэнні з англійскай мовы студэнткі 4 курса Паўліны Архангельскай падрыхтаваны да друку Марынай Макарыч.

## Памяць, якая сілкуецца любоўю

У рубрыцы «Асоба» — інтэрв'ю Ксеніі Зарэцкай з Таццянай Пташнікавай. У гутарцы дачка пісьменніка Івана Пташнікава разважае аб характары сямейных узаемадачыненняў, праве выбару ў жыцці, у прафесійнай сферы, нават у мове, і як пажаданні бацькі паўплывалі на яе самавызначэнне: «Тата прымаў рашэнні сваіх дзяцей, не прымушаў ісці па пратаптаных сцежках, мы выбіралі свой шлях, і ён нас у гэтым падтрымліваў».

Таццяна Іванаўна распавядае, як праз нягоды і хваробы бацькоў вярнулася з бізнесу да філалогіі, як гуманітарныя веды дапамаглі ўжо яе дачцэ, якая занятая зусім у іншай сферы.

Асабліва яркае ўражанне стварае частка інтэрв'ю, дзе Таццяна Пташнікава разважае аб стасунках бацькоў, аб віры пачуццяў, а з часам — аб неверагоднай блізкасці і падтрымцы: «У іх была моцная сувязь, якая для мяне стала прыкладам. Мама была яго дарадцам, самым першым чытачом, сябрам, надзейным тылам і, вядома, каханай жанчынай». Тут жа знойдзем колькі радкоў Івана Пташнікава жонцы з неапублікаванага раней — вершы, са слоў дачкі, бацька прысвячаў каханай і пасля яе сыходу. Вось адзін з прыведзеных фрагментаў:

*…З зямлі сырой, з зямлі замёрзлай*
*Ты віншаванне мне прышлі…*
*І пажадай, каб дзень апошні*
*Сустрэў я мужна на зямлі…*
*(31 снежня 1996 г.)*

Дачка пісьменніка заўважае, што Іван Мікалаевіч быў чалавекам справы, хаця вонкава і не дужа мяккім. Гэта праяўлялася і ў сям'і, і ў іншых сацыяльных ролях: «За яго знешняй суровасцю хавалася вялікая чалавечнасць, асабліва гэта выяўлялася, калі хто-небудзь трапляў у бяду або захворваў. Усё роўна, чалавек ці жывая істота. Колькім людзям ён дапамог!»

Таццяна Пташнікава адказала на пытанні ў тым ліку пра сяброўства Івана Мікалаевіча з Іванам Чыгрынавым і стасункі з іншымі пісьменнікамі, пра пэўныя традыцыі, якія складваліся ў колах інтэлігенцыі таго часу.

Праз прызму аповеду дачкі пісьменніка бачыцца і яе ўласны партрэт Івана Пташнікава (яго псіхалагічныя рысы, стаўленне да тых ці іншых з'яў), і партрэт сям'і ў дэталях, характар узаемаадносін блізкіх людзей, прыклад бацькоў для Таццяны Іванаўны, любоў, глыбокая ўдзячнасць і павага.

Колькі ж тут асабістага-асабістага… Гэта варта пабачыць і спецыялістам, і кожнаму дасціпнаму аматару беларускай літаратуры. Матэрыял багата аздоблены фотаздымкамі з сямейнага архіва Пташнікавых, таксама дапоўнены ліставаннем Івана Мікалаевіча да будучай жонкі Валянціны і ад Івана Чыгрынава.

## Не (мар)наваць часу

Літаратурны конкурс «БрамаМар» для моладзі ладзіцца факультэтам журналістыкі БДУ вось ужо цягам 12 гадоў. Яго вынікі — у сёмым нумары.

Паэтычныя старонкі прадстаўлены імёнамі Паліны Корневай, Маргарыты Стрыевіч, Ганны Ровінай, Ягора Сухалета, Даяны Лукашонак, Паліны Дваранскай (памятаеце, Паліна выступіла і з апавяданнем у рубрыцы «Проза»?). Разнастайныя лёсы, а таму і «характары» ў вершаў адрозныя па сваім фармальным і змястоўным напаўненні. Чытаем пра любоў, каханне, мару, дом і Радзіму, мастацтва, якое лекуе.

Тры празаічныя творы — «Імгненне» Арцёма Салькова, «Лілеі» Дар'і Багдановіч (уважлівы чытач «ЛіМа» і «Маладосці» заўважыць, што ў мінулым нумары таксама былі «Лілеі», але іншай аўтаркі — Крысціны Лосевай), «Галоўны герой памірае ў канцы» Андрэя Балкоўскага. Першае апавядае пра каханне на адно імгненне, другое — пра нязбытнае каханне як хваробу, трэцяе — …пра кукурузнае поле-лабірынт, «гіганцкае, любаснае» сэрца і смерць галоўнага героя ў канцы… Цікава, што Арцём Сальков і Андрэй Балкоўскі звяртаюцца да сваіх чытачоў ад першай асобы праз апавядальніка: Арцём — напрыканцы, тлумачыць, пра каго/што ідзе гаворка, а Андрэй — у пралогу, быццам загадзя здымае з сябе адказнасць за адчуванні рэцыпіента, запускаючы гульню з ім.

## Водгукі на творчасць. Сакрэты

У рубрыцы «Мастацтва» прапанаваны артыкул, прысвечаны буйному мастаку XIX стагоддзя Юзафу Аляшкевічу. Аўтар — вядомы пісьменнік і папулярызатар айчыннай гісторыі Вітаўт Чаропка.

Аглядальніца Ксенія Зарэцкая працягвае рубрыку рэцэнзій на аднаактовы балет «Пасляпаўдзённы адпачынак» па матывах лібрэта Клода Дэбюсі «Пасляпаўдзённы адпачынак фаўна» Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра.

У «Літаратурным свеце», наўмысна ці не, апярэджваючы будучы дзень нараджэння згаданага раней Вітаўта Чаропкі, з'яўляецца агляд Ангеліны Данцовай другой часткі рамана пісьменніка «Паўшыя анёлы», а таксама водгук на апавяданне Алены Стэльмах «Страта».

Валерый Максімовіч падкрэслівае важнасць і неабходнасць краязнаўчых даследаванняў, асабліва лакальных, звяртаючыся да кнігі Алеся Карлюкевіча «Пухавіччына. Літаратурнае гняздо Беларусі», дзе ў шырокім гістарычным кантэксце на прыкладзе аднаго рэгіёна разглядаюцца постаці Я. Купалы, К. Крапівы, А. Бачылы, Т. Бондар, М. Чарота і іншых, падкрэсліваецца значэнне культурнай прасторы ці «культурных гнёздаў», дзе ўзрастаюць таленты ад літаратуры.

Пра свае творчыя пошукі беларускі фантаст Алесь Бычкоўскі выказваецца наступным чынам: “Не бяруся пісаць, пакуль не адбудзецца “шчоўк!”, пакуль не затрымцішь». У прапанаваным расповедзе — пра літаратурную працу пісьменніка, чые творы ў спрыяльных умовах сталі б выдатным матэрыялам для экранізацыі.

Нязменнай аздобай часопіса з'яўляюцца не пазначаныя ў змесце апытанкі для аўтараў, у якіх можна даведацца пра шлях чалавека ў літаратуру, што натхняе, што сілкуе ў творчасці.

Прыемнага чытання!

**Кацярына ЦІМАНОВІЧ**

# Бакал з боскім водарам

**Што такое пераклад, у мастацкіх колах шмат гаварыць не трэба. Кожны, хто цікавіцца літаратурай, здагадаецца, што гэта такое. А ёсць яшчэ і перакладанне, па-руску кажучы, «переложение». Яны, хоць і абяцаюць адно і тое, на практыцы крыху розняцца. У чым гэта праяўляецца, лепш за ўсё адкажуць тэарэтыкі літаратуры. Але, як сказаў неўміручы Іаан Гётэ: «Суха, мой друг, теория везде. // А древо жизни пышно зеленеет!»**

Гэта тычыцца і вызначэння паняцця «переложение». Нельга не прыняць пад увагу меркаванне тых, хто перакладамі займаецца даўно, вобразна кажучы, на іх зубы з'еў. Прынамсі, Анатоля Аўруціна, кніга якога «Аллегории любви» пабачыла свет у маскоўскім выдавецтве «Российский писатель». Пытацца пра гэта ў яго не трэба. Аб тым, што ў ёй змешчаны не традыцыйныя пераклады, сведчыць падзагаловак «переложения».

Сказаўшы «а», Анатоль Юр'евіч у самым пачатку патлумачыў, чым кіраваўся, завастраючы ўвагу менавіта на гэтым моманце пры збліжэнні розных літаратур, а калі быць канкрэтным — надаючы паэзіі розных літаратур рускамоўнае гучанне: «Стихотворение — это бокал с божественным нектаром. Когда я его переливаю с одного языка на другой, главное для меня — передать не столько форму бокала, сколько аромат волшебного напитка».

Вабнасць водару, яго ні з чым не параўнальны пах, што пачынае вылучаць свае жыватворныя сокі, улоўліваеш, ужо знаёмячыся з анатацыяй. Не сумняваешся, што сустрэча прынясе радасць.

Ды, як у нас, беларусаў, кажуць: мала нешта добра згатаваць, трэба яго яшчэ і ўмела падаць. Умелая ж падача — гэта не проста звычайны адбор аўтараў для перакладу. А ўвайшлі ў кнігу творы аўтараў, пачынаючы з антычных паэтаў і завяршаючы японскай паэзіяй, — несумненна, тое з напісанага творцамі розных народаў, што найбольш хвалюе самога перакладчыка. У дадзеным жа выпадку, як гэта відаць з загалоўка, у асноўным адпавядае названай тэме.

Дарэчы, істотны і такі момант. Анатоль Аўруцін — з тых аматараў літаратуры, хто ў хатняй бібліятэцы трымае толькі кнігі, з якімі пазнаёміўся. Несумненна, гэта таксама ў нечым уплывае на суб'ектыўны падыход пры адборы аўтараў для перакладу. Але адначасова сведчыць і аб высокім мастакоўскім гусце. Калі «лішняе» не чытаецца, то тым больш не перакладаецца. Атрымалася як бы сціслая анталогія паэзіі, перастворанай па-руску адным аўтарам. Такія кнігі некалі выпускала выдавецтва «Мастацкая літаратура» ў серыях «Кніга перакладчыка» і «Паэзія народаў свету».

Чытач, дасведчаны ў паэзіі, мяркую, адчуе і яшчэ адну адметнасць кнігі «Аллегории любви». Найперш гэта тычыцца падборкі «З беларускай паэзіі», якая ў ёй самая прадстаўнічая. Шмат каго ў ёй здзівіць малая колькасць змешчаных твораў знакамітых паэтаў, а некаторыя слаба прадстаўлены. Што на гэта адказаць? Ды тое, што было вышэй сказана. Суб'ектыўны адбор не перашкодзіў… аб'ектыўнасці. Узята толькі ўсё самае-самае лепшае і на зададзеную тэму.

Адчуе патрабавальны чытач і іншае. Не сакрэт, што асобныя крытыкі з сучасных звычайных беларускіх паэтаў лёгка робяць беларускіх Сяргееў Ясеніных. Ці праводзяць гэтакую паралель з іншымі класікамі. Прачытаўшы ў перакладзе Анатоля Аўруціна творы такіх прэтэндэнтаў на знакамітасць, многія не толькі прыйдуць у захапленне, а і падумаюць: «Няўжо я памыляўся?» Аднак тут жа ўспомняць, што Анатоль Юр'евіч, ставіў перад сабой задачу — «передать не столько форму бокала, сколько аромат волшебного напитка». А словы ў яго ніколі не разыходзяцца са справай. Таму і паэзія прэтэндэнтаў парадніцца з Сяргеем Ясеніным і загучала па-ясенінску. Вось што значыць сапраўдны перакладчык, а перадусім і паэт.

А як умее ён «прымусіць» загаварыць па-руску беларускіх паэтаў, спашлюся на некалькі прыкладаў. Не ведаю,




як іншых, а мяне ўразіла, як беражліва, з любоўю і патрабавальнасцю Анатоль Аўруцін аднёсся да шэдэўра нашай нацыянальнай лірыкі — «Раманса» Максіма Багдановіча. Настолькі гэта кранае душу, што адчуванне такое, быццам па-беларуску напісаны. Адчуваецца, згадваючы рускага класіка, «рускі дух», але ў той жа час і ўсё беларускае. Ужо тое, што словы «зорка» гучыць па-беларуску, упэўнівае, што гэта сваё, нашанскае. Гэта тая «зорка», якая ніколі не пакідала паэта, а яго адзін з самых галоўных твораў стане для рускамоўных чытачоў сваім. Нават для тых, хто знаёмы з іншымі рускамоўнымі перакладамі згаданага твора.

*Зорка Венера взошла над землёю,*
*Память о прошлом под нею светла.*
*В час, когда мы повстречались з тобою,*
*Зорка Венера взошла.*

*С той поры, к небу взор обращая,*
*Я каждый вечер смотрел на неё.*
*Тихой любовью к тебе, дорогая,*
*Полнилось сердце моё.*

*Но расставанье судьба нам сулила,*
*Видно, нам вместе быть не суждено.*
*Тихой любви неизбывную силу*
*Я сберегу всё равно.*

У шматгалосым хоры беларускіх паэтаў акрамя класікаў гучаць галасы Сцяпана Гаўрусёва, Анатоля Грачанікава, Уладзіміра Паўлава, Анатоля Шушко, Яўгеніі Янішчыц і іншых. У перакладзе, захаваўшы сваю адметнасць дзякуючы таленту Анатоля Аўруціна, яны яшчэ больш набліжаюцца да рускамоўнага чытача, пераконваюць у тым, наколькі шырокія набыткі і абсягі беларускай «госці нябеснай». Адметна таксама тое, што перакладзены і паэты, якіх за межамі Беларусі ведаюць менш. Нават Міколу Федзюковіча, кніга якога «Птичье дерево» ва ўзнаўленні Івана Бурсава ў 1976 годзе выйшла ў Маскве, новае пакаленне наўрад ці ведае. А якім цудоўным паэтам ён быў, можна ўпэўніцца і па гэтым безназоўным вершы:

*Расстояния, даты —*
*всё стало ненужным…*
*Меж тобою и мною тревог полоса.*
*Я на Северном нынче,*
*Ты нынче на Южном…*
*Мы на разных живём полюсах.*

*В стороне от друзей, и ершистых,*
*и милых,*
*В стороне от наезженных*
*звонких дорог,*
*Я блуждаю по улицам наших ошибок,*
*Ты — по улицам наших тревог.*

Тэкст так і просіцца на песню, хай сабе і рускамоўную. Асабліва калі прыняць пад увагу, што эфір запаланілі «сучасныя», у якіх словы «дура» і «дурань» — найбольш «эстэтычны» варыянт пры высвятленні адносін паміж Ёю і Ім. У Міколы ж Федзюковіча — гэтакая шчырасць, праўдзівасць і жыццёвасць. Такая, што ў песні нязменна выклікае шмат роздуму.

Бакал жа з Боскім водарам, паднесены Анатолем Аўруціным, таксама выклікае шмат асацыяцый. Таму яго і не трэба піць нагбом. Напой у ім настолькі чароўны, што хочацца даўжэй затрымаць яго каля вуснаў. А пасля піць, смакуючы глыток за глытком.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**




# Незабыўнае, не забытае

**Заўсёды прыемна, калі нешта добрае ў жыцці атрымлівае працяг. Асабліва тады, калі да ўжо вядомага табе дадаецца штосьці новае. Гэта якраз такі выпадак. Некалькі нумароў назад «ЛіМ» адзначыў 110-годдзе вядомага літаратуразнаўцы і педагога Васіля Івашына, засяродзіўшы ўвагу на яшчэ адным баку яго творчасці. Васіль Уладзіміравіч, як вядома, пісаў вершы. Як і многія, узяўся за іх юнаком. Ды многія з гадамі забываюць сваё колішняе захапленне. Ён жа, наадварот, успомніў пра яго ў сталым узросце.**

Чытачы пра гэта таксама даведаліся з «ЛіМа», разгарнуўшы нумар за 17 мая 2013 года. Пасля былі новыя публікацыі, выйшлі кнігі «Слова», «Покліч памяці», «З верай і надзеяй», «Прызванне». І вось чарговая сустрэча з паэтам Васілём Івашыным. Парупіліся дзеці Васіля Уладзіміравіча Аляксандр і Наталля, а таксама Аляксандр Калюта, які разам з імі з'яўляецца і ўкладальнікам кнігі «Незабыўнае…». Адметнасць яе ў тым, што да чытача прыйшлі асобныя з твораў, якія, як сказана ў анатацыі, пісаліся «на ўзмежжы XX і XXI стагоддзяў. Разнастайная па змесце, танальнасці, паэтычнай энергіі, філасафічнасці лірыка — гэта роздум над вечнымі тэмамі і каштоўнасцямі жыцця, своеасаблівы маналог чалавечай душы».

Наколькі праўдзівае такое сцвярджэнне, відаць з уступу Алеся Бельскага, які некалі працаваў разам з Васілём Івашыным у Нацыянальным інстытуце адукацыі. Як вядома, Васіль Уладзіміравіч быў акадэмікам Акадэміі педагагічных навук СССР, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, з'яўляўся доктарам філалагічных навук. Стасункі на працягу не аднаго года спрыялі лепшаму спазнанню Васіля Івашына як чалавека і як грамадзяніна. І, канешне, разуменню, які гэта арыгінальны і пасвойму цікавы паэт. З тых творцаў, каго паўсядзённая праца, незалежна ад таго, чым яны займаюцца, не пазбавіла ўменя не толькі захапляцца прыгажосцю, а і па-свойму выказваць яе ў творах. Па-свойму — значыць, традыцыйна падыходзячы да ўспрымання рэчаіснасці, пісаць так, каб яна ў нечым не гучала другасна. Каб гэта было менавіта сваё, прамоўленае так, як іншы перадаць не можа. Таму і не можа, што, хоць для сапраўднага паэта талент і важны, ён, з'яўляючыся першаасновай, Усявышнім дадзенай, не адмаўляе, аднак, і свой погляд на рэчы, з'явы, урэшце, што асабліва важна, на самога чалавека.

Аднак прадстаўленне пэўнага паэта, якім бы ўхвальна-цікаўным і разам з тым патрабавальным яно ні было, хоць і важнае, але, зразумела, у нечым гэта і ўспрыманне на веру. Мала, каб упэўніца, наколькі гэты творца бачыцца асобай. Кожны чытач, знаёмячыся з ім, абавязкова будзе мець уласнае ўяўленне. Зыходзячы з канкрэтных твораў. Прапускаючы іх праз сябе. Думкі, пачэрпнутыя ўражанні абавязкова выклічуць сваё ўспрыманне, адпаведны рэзананс.

Чаму па-добраму нельга не пазайздросціць у творах Васіля Івашына, дык гэта яго аптымізму. Нават не хочацца пісаць — аптымізму яго лірычнага героя. Безумоўна, ён адпавядае таму, каб ставіцца да яго з пункту гледжання тэарэтычных разваг. Але пры такім стаўленні ў нечым страчвае сваю асабовасць, а ён жа — канкрэтны, рэальны чалавек. Яго бачыш перад сабой, як жывога. Цяпер, калі сам аўтар даўно ўжо ў іншым свеце, тым больш. Прамоўленае дае падставы для гэтага. У радках гаворыць душа зямнога чалавека з яго зямнымі клопатамі. Ён увесь у дзеянні, у руху:

*Мне ўсё сніцца і сніцца дарога,*
*Ля дарогі бярозавы гай.*
*І вядзе яна ў свет ад парога,*
*У нейкі дзіўны нязведаны край.*

*І, здаецца, іду я да сонца,*
*Прысняшаючы час і хаду.*
*А шлях цягнецца ўдалеч бясконца…*
*Я іду… Ўсё іду… Ці дайду?*

Дзякуючы творам, прадстаўленым у «Незабыўным…», Васіль Івашын і ідзе да нас. Не проста ідзе, а ў гэтай хадзе ёсць важная мэта. Яна ў вершы не называецца, але што азначае, здагадацца няцяжка. Васіль Уладзіміравіч хацеў заставацца нашым сучаснікам і пасля таго, як яго пакліча ўжо іншая дарога. Дзякуючы найлепшым сваім вершам — і застаўся.

Развітваючыся з жыццём, знаходзячыся на парозе таго невядомага, што вядзе ў іншы свет, зразумець які нам ніколі не дадзена, ён напісаў свае апошнія радкі:

*Мінулае прайшло, адплыло, адгаманіла,*
*І ўсё ж не страчана яго жывая сіла,*
*Яна наступнаму прызначана,*
*І ўсё найнова перайначана.*

Да свайго 100-годдзя не дажыў тры гады. Пражыў куды больш, чым Іааган Вольфганг Гётэ. Прыгадваецца ён невыпадкова: «"Наш Гётэ" — так называлі сямейнікі Васіля Уладзіміравіча за яго захопленасць паэзіяй, натхнёнасць, з якой нараджаліся радкі пра каханне». А іх у кнізе «Незабыўнае...» — шмат. Гэта таксама даказвае, што Васіль Івашын — паэт сапраўдны, бо хіба можа быць іншым творца, які апявае гэтае адно з самых светлых людскіх пачуццяў?

**Ганна ІВАНЕЙ**



## Соф’я ШАХ

### Ізяславу Катлярову на 40 дзён

* * *

*Ну і дзе ж ты зараз там*
*сорак дзён сваіх лунаеш?*
*Што, не знанае і снам,*
*для сябе там адкрываеш?*
*Немаведамы іспыт,*
*веру, вытрымаеш строга,*
*здолеўшы зямны нябыт*
*і з’явіўшыся прад Богам.*
*Ну а тут жыццё жыццём —*
*то павольнасцю, то спехам…*
*Людзі, птушкі, вецер, гром, —*
*лета застаецца летам.*
*Ліпень чэрвеня змяніў,*
*жнівень — ліпеню замена.*
*Ім абвал, аблом, абрыў —*
*не праблема і не тэма.*
*Сінь — сінечай, глыб нябёс,*
*мкнуцца ў далеч аблачыны…*
*І ў цябе ўжо новы лёс*
*будзе, муж мой незабыўны.*

* * *

*Наіўна ў нябёсы гляджу,*
*наіўна яшчэ ўсё чакаю,*
*што пераадолець мяжу*
*таго невядомага краю*
*дазволяць урэшце табе,*
*і ты ўжо калі не намёкам,*
*то ценем яго скажаш мне,*
*паведаміш хоць адгалоскам,*
*што ўсё там як мае і быць*
*з табой, над табой, за табою,*
*і ўжо там табе не баліць —*
*што тут прызнятала сабою.*
*Што сорак мытарыстых дзён*
*ты вытрымаў годна-пачэсна,*
*ды помніш узрушаны плён*
*зямной нашай долі сумеснай.*
*І помніш узнёслы настрой:*
*мы тут на дваіх мелі крылы…*
*Мне справіцца з імі адной*
*працi там нябесныя сілы.*

* * *

*Ну а мне тут без цябе*
*глуха, нема, слепа,*
*бы завісла я цяпер*
*між зямлёй і небам.*
*Знаю, знаю, што пара*
*павярнуць да грунту,*
*дзе плён сэрца і пяра*
*мкне да абсалюту.*
*Дзе між кніжак запісных,*
*спісаных блакнотаў*
*зрок застаўся твой і слых,*
*мрояць думкі ўпотай.*
*Дзе між споведных радкоў,*
*поўных болю-жалю, —*
*скарб нявыказаных слоў*
*спее выссю-даллю.*
*Дзе ўвесь твой пратэст і гнеў,*
*мары, скрухі-страхі*
*увасоблены ў спеў*
*ад няўтольнай прагі*
*жыць і жыць, бясконца жыць,*
*славіць душ прыгоства, —*
*краю любаму служыць*
*праз высакародства.*

* * *

*Ведаеш, — я надта спадзяюся,*
*што, трымаючы экзамен там,*
*ты забудзеш аб пякельнай скрусе,*
*што не мучыць, здзівішся ўжо сам.*
*Ды не буду ўдакладненне дзейсніць,*
*бо і так навідавоку ўсё, —*
*ну амаль у кожным вершы сведчыць*
*непазбежнай долі пачуццё.*
*Хто захоча, той і прачытае,*
*як ты тут і жыў, і гараваў,*
*як змагаўся, няньчыўся з адчаем,*
*як збавення ў рытмах слоў шукаў.*
*І шукаў, і быццам бы знаходзіў,*
*ды, аднак жа, на кароткі час,*
*бо адчай усё-ткі не праходзіў,*
*бо з маленства моцніў свой запас.*
*Нарадзіўся — знаць, наканавана*
*некалі пакінуць гэты свет…*
*І пакінуў — стаў цяпер мне тайнай,*
*бедны для якой любы сюжэт.*
*І любое нават уяўленне,*
*і любой фантазіі раскат…*
*Дай Гасподзь табе і там натхнення*
*увасобіцца ў нябесны лад!*

* * *

*Помню, помню — і тут нагадаць*
*два радкі твае зараз пасмею:*
*«Нету смысла мне там отдыхать,*
*ведь работать я там не сумею…»*
*Дык ніхто адпачынку табе*
*і не дасць, хаця свету ўжо змена.*
*Ты ў дачаснай сумоце-журбе*
*хваляваўся пра гэта дарэмна.*
*Для душы, для такой, як твая,*
*там адразу ўжо знойдуць занятак.*
*Ох як згодліва ўпэўнена я:*
*знойдуць-знойдуць, хоць мне ён —*
*з загадак.*
*Не дадуць табе там сумаваць,*
*час праводзіць у тлумным бадзянні.*
*Ты і там будзеш вершы сляваць,*
*мо шчэ ў большым, як тут,*
*хваляванні.*
*Або нават у жывапіс ты,*
*або музыкай мары ўпрыгожыш…*
*Знoўку моцны, ізноў малады,*
*лёс тварыць новы й там плённа*
*зможаш.*

* * *

*Ну а я тут… Я ўжо тут як-небудзь…*
*Я ўжо тут, — як дасць праміпы Бог.*
*Мне б, што ладна ўсё ў цябе там,—*
*ведаць,*
*паміж новых жывучы трывог.*
*Ды і працы ты пакінуў столькі*
*мне тут незавершанай сваёй!..*
*Так што аніякае палёгкі*
*ў жыцці не прадбачыцца маёй.*
*Вось чакаю восені…*
*А потым*
*любая пара твая — зіма.*
*А далей… Казаць няма ахвоты.*
*Пра вясну ўяўлення нат няма.*
*Ну а лета не было ніколі*
*існасна жаданым для мяне:*
*даставалася заўсёды долі*
*ад яго па немалой цане.*
*І цяпер вось пікам стромкім стала —*
*вымкнула на вечную мяжу…*
*Не хвалюйся там — я ўжо сказала:*
*працы многа, ёй аддам душу.*

* * *

*Выплакала вочы,*
*выплачу душу, —*
*дух, што стаў сірочым,*
*словам не скажу.*
*Літары слабыя,*
*кволыя склады, —*
*вялая стыхія*
*для такой бяды.*
*Кропкі, коскі, рыскі —*
*глухата сама:*
*белы свет ім блізкі,*
*а нябелы — цьма.*
*Так і мне на ўзбочы:*
*думкі ўюць імжу…*
*Выплакала вочы,*
*выплачу душу.*

* * *

*Глуха-ціха ў кабінеце,*
*безаблічна — стол і стул…*
*За акном — гулліві вецер,*
*за акном — машынны гул.*
*Безгалосая кватэра,*
*і ўся ўтульнасць — нібы зман…*
*За акном — жывая сфера,*
*за акном — імкненняў стан.*
*Сценам цяжкія карціны,*
*шафам кнігі — гнёт вагі…*
*За акном — распеў птушыны,*
*за акном — паток людскі.*
*Тут і там — падзел яскравы.*
*Што яшчэ тлумачыць, як?!*
*Розніца — рэальнасць явы,*
*а ўсвядоміць — аніяк.*

* * *

*«І ўсё-такі ну як ты там?» — пытанне*
*пашлю ў далёкасць-высакасць тваю,*
*а ў рэчаіснасці, як для адхлання,*
*яго я проста ветру аддаю.*
*Адказу не чакаю. Што мне вецер*
*данесці можа гэткае цяпер,*
*калі ўжо ты зусім у іншым свеце,*
*у іншай, баганоснай сферы сфер?!*
*А тут які ні стрэнецца прахожы,*
*не ў слых мой кажа, праменька ў душу:*
*«Харошы чалавек быў,*
*ой харошы!..» —*
*і я ў сабе зноў слёз камяк душу.*
*Якое «быў»?! Ты ж ёсць,*
*ты ёсць дакладна!*
*Інакшы стан свой спазнаеш сабой,*
*а значыць, усёй сутнасцю спагаднай*
*жывы ты і для вечнасці самой.*

# Пад зорнымі крыламі



## Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

### Лета Багдановіча

…У першы свой прыезд у Беларусь менавіта ў Ракуцёўшчыне Максім Багдановіч адчуў усё хараство і багацце жывой беларускай гаворкі. Ён прагна ўбіраў кожнае беларускае слова, прасіў усіх гаварыць з ім па-беларуску. Пасля ракуцёўскага лета нарадзіўся сапраўдны беларускі паэт.

*Ракуцёўскае лета іскрылася*
*Светлячкамі ў вячэрняй расе,*
*І ўзыходзіў над зорнымі крыламі*
*Над палямі зноў месяца серп.*

*І юнак праз сцяжыначку вузкую*
*Крочыў, поўны натхнення і сіл.*
*«Гаварыце са мной беларускаю», —*
*Ён у птушак і дрэваў прасіў.*

*Ён вяртаўся да светлага, існага,*
*Да таго, што з дзяцінства шукаў.*
*І знаходзіў адметную існіну*
*Сярод кветак і жнівеньскіх траў.*

*Ён вярнуцца да словаў пранізлівых,*
*Што з Радзімаю звязваюць, змог.*
*Ён сплятаў шчодра светлымі нізкамі*
*Іх у вершаў прыгожы вянок.*

*Засталося нашчадкам парукаю,*
*Што з надзеяй пакінуў паэт.*
*«Гаварыце са мной беларускаю!» —*
*Ён прамовіў, нібы запавет.*



Фота Ташы Шпакоўскай.

* * *

*Птушыны спеў абудзіць неруш*
*Над яшчэ соннаю зямлёй.*
*І паімкнецца светла ў неба*
*Самотны ціхі одум мой*
*Пра тое, што паспець не здолеў*
*(А восень мкнецца на парог),*
*Пра лёс людскі, пра родны долю,*
*Пра вечны ад жыцця урок.*
*Пра самы лепшы край на свеце,*
*Пра слёз салодкіх забыццё,*
*Пра новы дзень, пра дождж і вецер,*
*Пра сэрцаў дарагіх біццё.*

* * *

*Аднойчы ў цішыні суровай,*
*Калі ў маўчанні ўсё вакол,*
*Пастукаецца сэрцу слова*
*Сваёю праўдай трапяткой.*

*Пацягне белізна паперы,*
*Разбудзіць у душы агонь,*
*І так захочацца паверыць*
*У праўду светлую яго.*

* * *

*Услухайся ў сябе і ў цішыню,*
*І раптам нечакана зразумееш,*
*Што сэрца ўдзячна ціхаму агню,*
*Калі яго ў душы адчуць сумееш.*
*Пачуеш, як дажджынкі зазвіняць,*
*Як вецер зашапоча над таполяй,*
*Як ахіне спагадай цішыня,*
*Нібы адхланне і душы патоля.*

* * *

*«Што засталося?..» Многае прайшло,*
*А нешта, што хацеў, і не збылося.*
*Пытае ноччу зорнае святло:*
*«Што засталося?»*
*Сказаць, што ўжо аддадзены даўгі,*
*Што шмат спазнаў каханняў і надзеяў,*
*Што стаў такім і ўжо не стаць другім,*
*Што ўсё ў шляху, хаця не маладзею?*
*Што толькі любай роднай мовы смак*
*Зноў на губах гарыць, як пацалунак,*
*Нібы ад грозных бураў і атак*
*Адзіны наймагутнейшы ратунак?..*
*Што засталося? Родны горад мой,*
*Бацькоў магілы на кладах маўклівых.*
*І ранкі над вячыстаю Дзвіной —*
*Як успаміны аб гадах шчаслівых…*

# Людзі з нашага пад’езда

## *Урывак з рамана*



**«Лагойскі тракт» — кніга прозы рускамоўнага пісьменніка Аляксандра Сакалова, якая рыхтуецца да выхаду ў Выдавецкім доме «Звязда». Асноўнае месца ў ёй займае аднайменны раман. Як сведчыць аўтар, «гэта аповед аб жыцці ў самых розных яго праявах, аб людзях, якія акружаюць галоўную дзейную асобу, аб каханні і многім іншым, што акружае нас і складае палатно жыцця». Аповесць «Прышэльцы», напісаная ў стылі фэнтэзі, — працяг рамана «Прышэлец». Змешчана ў кнізе і апавяданне «Навагодняя ноч у Колпіна».**
**Прапануем увазе чытачоў адзін з раздзелаў рамана «Лагойскі тракт».**

**Аляксандр САКАЛОЎ**

Свет змяніўся і памяняў людзей? Яны страцілі імкненне быць станоўчымі, што было раней негалоснай умовай поспеху сярод акружэння? Ці, можа, я перабольшваю? Людзі былі і застаюцца такімі рознымі, іх сутнасць часам вырываецца вонкі, і застаецца дзівіцца таму, што хаваецца ў іх…

Пра гэта разважаў Вальноў, напяваючы сабе пад нос словы нядаўна пачутай песні: «Хто вы, людзі, што стукаецеся ў дзверы: браты, сёстры ці, можа, звяры?» Ён займаўся рамонтам лоджыі ды разважаў аб бягучым жыцці.

Усё ж праз час у яго новай сям’і ўсталяваўся спакой. Дзяўчынкі падраслі і прыкметна пасталелі. Аляксандра паспяхова вучылася ва ўніверсітэце, атрымлівала стыпендыю і хацела вучыцца далей. Юлечка ўсяляк заахвочвала яе мару, яна аплаціла ёй паездку для вывучэння замежнай мовы, што рабіла і раней.

Надзея прыкметна выцягнулася, папрыгажэла, яе капрызлівы характар неўпрыкметку памякчэў, але зацінутасць заставалася яе галоўнай рысай, у якой, відаць, былі свае карані.

Вальнову ўдалося часткова разгадаць матывы яе паводзін, і яны, на жаль, тычыліся яе ранейшых адносін з бацькам. Так, у яе старым тэлефоне, выкінутым за непатрэбнасцю, Вальноў знайшоў СМС-кі, адпраўленыя маці, аб тым, што «гэты дэбіл пабіў мяне».

Навошта мог гэта зрабіць «былы», з якім Вальнову сустракацца не даводзілася, і пры якіх абставінах — ён не ведаў. Юля пазбягала размоў на гэтую тэму і ўсяляк адмаўляла падобныя факты.

Але вось у рукі Вальнова патрапіў і дзённік Надзі, які разам з непатрэбнымі паперамі ён вывез за горад для падпалкі каміна. У ім, старанна выстаўляючы лік і дату, дзяўчынка пісала: «Я зараз сяджу дома чакаю Аксану яна прыйдзе ў 11.30 сумна, гэты дэбіл мяне дастаў накрычаў на мяне. Педзік нейкі. Нам па фізіцы далі зрабіць праект я яго раблю з Дашай».

Ліст прыведзены без купюр. Самым сумным было тое, што калі дзяўчынка называе бацьку «дэбілам», то з такога стаўлення мог з’явіцца толькі негатыў да ўсіх мужчын…

Ва ўсякім разе, Вальнову стала зразумелая першапачатковая варожасць Надзеі. І тут шчодрасцю і каханнем такі стан вылечыць немагчыма. Усё, што ён ні зробіць добрага для яе, будзе расцэнена як спроба купіць яе...

Вальноў знайшоў, як здавалася яму, самы дакладны спосаб: не ўмешвацца, не выхоўваць, не лезці з драбязой; дапамагаць там, дзе ёсць неабходнасць, дзе не хопіць сіл у Юлі. Гэтая тактыка працавала і ў штодзённым жыцці, і ў сумесных паездках на адпачынак.

Спакой, згода ў доме дорага каштуюць, і ўсё гэта Вальнову даводзілася выбудоўваць па цаглінцы, заклікаўшы на дапамогу ўраўнаважанасць, разумны сэнс, часам трапна-з’едлівае слова, захапляльнае — калі па справе, па справядлівасці…

Вальноў уладкаваўся ямчэй, прыладзіў чарговую пластыкавую планку і прыгатаваў шрубаверт, каб прыкруціць яе на сваё месца. Ён усміхнуўся сваім думкам: «Як можна назваць ворагам ветлівага маладога чалавека, які жыве на іх лесвічнай клетцы? Ён заўсёды першым вітаецца, добразычлівасць так і свеціцца на яго твары, калі ён выходзіць гуляць з жонкай і сваім маленькім сынам. Што ж, яму, відаць, пашанцавала з бацькамі, хутчэй за ўсё яны любілі адзін аднаго, любілі свайго сына: ён даб’ецца ўсяго ў жыцці сваёй усмешкай!»

Чаго не скажаш аб суседзях знізу. Пара як пара. У яе свая машына, у мужа — працоўны «конь», на якім ён заняты раз’ездамі па невядомых справах. Высокая, стройная, рашучая асоба прыгандлёўвала аўтамабільнымі запчасткамі. Рана аблыселы муж часцяком выводзіў на вуліцу двайнят-балонак, чаго ніколі не рабіла яго ўладарная жонка. Верагодна, яна была некалі прыгажуняй нумар адзін сярод акругі і меркавання была аб сабе найвысокага…

Неяк яна спыніла Юлю ў пад’ездзе і спытала: «Што за гукі ў нас у спальні па раніцах, у вас што, трэнажор для бегу?» «Ды не, нічога такога няма», — адказала сяброўка Вальнова.

Яшчэ раней суседка знізу запатрабавала, каб Юля змяніла хатнія тапкі: маўляў, абцасы стукаюць па падлозе і няма спакою. Юля змяніла тапкі. Але гэта быў толькі пачатак неабвешчанай вайны. Званок у дзверы. Вальноў адкрыў, званіла «рудая знізу», як ахрысціў «красуню» Аляксандр. Не паздароўкаўшыся: «Паклічце мне Юлю!» — не сказала, а скамандавала.

— А ў чым справа? Праходзьце, калі ласка, не стойце каля парога.

— Размова не з табой! Ты — ніхто, і клічуць цябе ніяк! Юлю мне!

— Прыемна, вядома, даведвацца пра сябе нешта новае, але ў мяне, як і ва ўсіх, ёсць імя па бацьку, і я — муж Юлі, здольны вас выслухаць.

— Муж? Не трэба мяне смяшыць! Нешта раней я цябе тут не заўважала! Да таго часу, як ты выступіў сведкам, калі абвінавачвалі майго мужа! Гэта ты тады стаяў каля машыны?

— Ну, дапусцім, я не стаяў, а выйшаў з пад’езда, і да мяне звярнулася міліцыя, каб я стаў панятым. А што, муж у нечым быў вінаваты?

Машыну, якая стаіць насупраць пад’езда, зламыснікі падрапалі, паламалі дворнікі і люстэркі. Вальноў выканаў фармальнасць, распісаўшыся ў пратаколе яе агляду. Побач пры гэтым стаяў лысы муж нашай «рыжулі» — як потым высветлілася, скарга ад уладальніка машыны паступіла на яго.

— Хто ты такі, каб мне пытанні задаваць? Лепш спыніцеся стукаць і шабуршыцца, а то мала не падасца!

— Мадам, здаецца, пагражае мне? А ці ведаеце, мілая, што я лячыўся пасля Афгана ў псіхіятрычнай клініцы? Вам вядома слова «посттраўматычны сіндром» і ўсё такое? Калі мяне раззлаваць, то я за сябе не адказваю! І мне нічога не будзе, у мяне — дыягназ!

«Мадам» пачала паволі адступаць і схавалася ў дзвярным праёме, перш чым Вальноў паспеў засмяяцца.

Увечары ён спускаўся на ліфце і на першым паверсе сустрэўся з «дабраверным» скандальнай паненкі, якая вырашыла задумаць скандальчык пад’ездавага маштабу з-за «супрацоўніцтва» Вальнова з міліцыяй і часткова з зайздрасці: магчыма, яна ўбачыла, як Вальноў і Юля цалуюцца, а можа, папсаваў новы Юлін аўтамабіль.

— Ну ты, афганец! Паглядзім, які ты на справе! Давай па-мужчынску, сам-насам!

— Думаю, што шмат гонару! Ты ж хто? Шпана мясцовага значэння? Думаеш, цябе будуць тут усе баяцца?

— Ды я табе, падла, усю машыну пакоцаю, будзеш бабкі адшпільваць як мілы!

— А ты будзеш падлогу на зоне мыць, я табе абяцаю! Ліхтар на Юлінай машыне ты пабіў? Вось зараз ты ўсё пра сябе расказаў! А я яшчэ думаў, гледзячы, як ты сабачак выводзіш, што, можа, не ён ламае нашы машыны? Рыхтуйся, хутка да цябе прыйдуць!

Мяркуючы па тым, як яго сусед знізу збялеў, Вальнову прыйшло ў галаву, што за ім ёсць і яшчэ сякія-такія грахі.

Быў яшчэ і сусед зверху. Але гэта, як кажуць, асобная песня, і нават не песня, а арыя з оперы! Знаёмства з пажылым джэнтльменам адбылося ў Вальнова, калі ў іх у ваннай па сцяжку пацякла вада. Аляксандр паспяшаўся наверх.

Дзверы адчыніў высокі сівы чалавек, імпазантнай знешнасці, з цёмнымі вачыма і такімі ж паўкругамі пад імі. У адказ на скаргу ён адчыніў дзверы ваннай, дзе ў яго ішоў рамонт, і выявілася, што вада гатовая праліцца ў пакой.

Сусед заахаў, перакрыў ваду, і Вальноў пачаў дапамагаць ліквідаваць наступствы, каб вада не паспела прамачыць столь. Удалай была тая акалічнасць, што працечка была своечасова выяўлена — інакш вада апынулася б на першым паверсе.

Пасля ліквідацыі наступстваў сусед шмат разоў папрасіў прабачэння, і яны па-сяброўску паціснулі рукі адзін аднаму. На развітанне Вальноў адважыўся задаць пытанне:

— Скажыце, гэта не вы спяваеце арыі? У нас такая добрая чутнасць! Вы, можа, былі спеваком?

— Не, спеваком я не быў, але пасля сувораўскага вучылішча, скончыў музычную школу... Проста люблю спяваць! Што, моцна замінаю?

— Ды не, што вы! Спявайце на здароўе! Бо калі сэрца спявае — значыць, жыццё ідзе... Тут словы залішнія! Я проста гадаў, адкуль могуць даносіцца гэтыя гукі спеваў. Вы паставілі кропку ў маіх здагадках! Тут вось мая суседка знізу істэрыку падымае, варта мне толькі няёмка крэсла перасунуць. Тэлефанавала дочкам, абяцае галаву адарваць!

— Ды яна і мне абяцала машыну пабіць, калі я рамонт рабіў. Потым хтосьці пабіў бампер на стаянцы, а гэтая пластмаса зараз дарагая…

— Вунь яно што! Ну добра, усяго найлепшага!

Вальноў неяк наведаўся да Івана на працу. У ягоным прасторным кабінеце за размовамі аб справах надзённых Вальноў расказаў яму пра сваіх суседзяў. Сакратарка прынесла ім каву, Іван выцягнуў на свет вялікую скрынку шакаладных цукерак:

— Вось, частуйся! Трымаю для сяброў. Самому нельга, кажуць, лішні цукар у крыві. Дык ты кажаш, адмысловец па рамонце машын? Афганцаў крыўдзіць?

Ён зняў тэлефонную трубку і пачаў набіраць нумар. Пачаліся ўзаемныя прывітанні і абмен нязначнымі фразамі, потым Іван стаў выкладаць сутнасць справы:

— Слухай, у мяне тут сябар, афганец, пісьменнік. Дык кажа, жыцця не даюць у пад’ездзе, пагражаюць аўтамабіль сапсаваць, ну, увогуле… ён сам табе раскажа. Ну, давай, шчаслівa!

— Саша, глядзі, вось табе тэлефон, набяры і з’ездзі да чалавека — гэта па яго частцы. Так пакідаць нельга! Шпана павінна ведаць пра сябе, хто яна! Хутчэй за ўсё, гэты агрэсар — падабцаснік неўраўнаважанай паненкі, якая ўявіла сябе каралевай Шантэклера...

Ну, ты скажы — цікавы народ цябе атачае! Чым не тэма для апавяданняў? А вось у мяне сусед — не паверыш: кожны год — дзвюх жонак мяняе. У яго дом прыстойны, участак вялікі. Рук не хапае. То ён дае аб’явы: «Шукаю жонку». Потым тлумачыць ёй, што годзік трэба прыглядзецца адзін да аднаго, паглядзець, якая яна працаўніца, а потым ужо распісацца. Усю вясну і лета жанчына ўкалвае на яго, імкнучыся дагадзіць і стаць жыхаркай яго церама, а ўвосень ён ёй кажа: «Прабач, ты мне не падыходзіш!» Ты ўяўляеш, калі гэтыя бабы збяруцца ўсе разам, што яму будзе?

— Цікавы экзэмпляр! Трэба мець нейкі асаблівы склад, каб вось так… Людзі не перастаюць дзівіць, і ў гэтым плане нездарма ў ходзе папулярнае: «Чым больш я пазнаю людзей…» Не скажу, што мяне цікавяць сабакі, апошнія гады ў мяне пільная цікавасць да дрэў. Асабліва здзіўляюць доўгажыхары, крона якіх нагадвае палацавыя скляпенні… Я табе пакazваў фатаграфію такога доўгажыхара, якую я прывёз з Кандзі, са Шры-Ланкі? Яго крона займае на плошчы квадратны кіламетр, галіны, як вялізныя шчупальцы-сінусоіды, спускаючца ўніз, пускаючы карані да зямлі, каб трымаць сваю густую лістоту. У яго галінах жывуць цэлыя калоніі розных птушак. Проста дзіва!

А з апошняй паездкі на Канары я прывёз скрыначку з насеннем гіганцкай акацыі. Сямёны памерам з фасоліну складзеныя ў зацвярдзелы панцыр, які нагадвае чахол з-пад каўказскага кінжала… Вось такі панцыр я ўласнаручна збіў з дрэва палкай, затым дома загарнуў насенне ў вільготную марлю, паклаў на тыдзень у сподак… Вясной пасадзіў у зямлю некалькі фасолін.

Увайшла сакратарка: «Іван Пятровіч, да вас Леанід Іванавіч…»

— Няхай уваходзіць!

Вальноў вярнуўся дадому, зазваніў яго мабільнік, высвеціўся Іван:

— Саша, дык што з акацыяй?

— Узышла, Ваня! Цяпер ужо расце ў кадцы, раскінула свае галінкі з лістотай, і няўрымна сябе адчувае! Прыязджай, убачыш на свае вочы!

Праз тыдзень Вальноў сядзеў у буйнога чыноўніка з МУС і выкладаў у падрабязнасцях спробы спецыяліста па псаванні машын жыхароў пад’езда. Вальноў папрасіў прабачэння з нагоды таго, што адбірае час па дробязях у занятых людзей, але яго запэўнілі ў адваротным і толькі спыталі: «Вы хочаце напісаць заяву?» Не, Вальноў не хацеў пісаць заяў, ён адказаў: «Калі можна, то без афіцыёзу».

Мінуў нейкі час, і званкі дзяўчынкам ад суседкі зверху з пагрозамі «адарваць галаву» спыніліся, а пры сустрэчы з «рудой красуняй» каля ліфта тая праводзіла Вальнова такім доўгім вымяральным поглядам, які мог казаць толькі аб адным: у «салодкай парачкі» пабываў участковы і правёў выхаваўчую гутарку.

Хто вы, людзі, што стукаецеся ў дзверы: браты, сёстры ці, можа, звяры?

**Пераклад Антося КІРЭЙЧЫКА**

# Помнік і адбітак эпохі

**Розныя выданні вяршыннага твора Якуба Коласа дазваляюць весці гаворку не толькі пра саму паэму і дынаміку яе ўспрымання ў грамадстве, але і закранаць некаторыя пытанні развіцця кнігавыдавецкай і бібліятэчнай справы ў рэспубліцы. Асабліва калі да асобных экзэмпляраў дакранулася рука класіка, пакінула аўтограф. Такая рукапісная мемарыяльнасць заклікае сфакусаваць увагу на асобных нюансах і эпізодах, у тым ліку дагэтуль не распрацаваных у коласазнаўстве.**

## На суд гісторыі

«Купіць зямлю, прыдбаць свой кут, // Каб з панскіх выпутацца пут…»; «Свая зямля — вось што аснова!» — ключавыя радкі твора падчас калектывізацыі прагучалі неадпаведна часу і выклікалі жорсткую крытыку.

У першым выданні «Новай зямлі» (1923) прадмовы ў яе звыклым фармаце не было. Але на асобнай старонцы змешчаны адзін лаканічны, кідкі для вока сказ з подпісам пісьменніка (тут і далей захоўваецца правапіс арыгінала):

*«Падзеі апісаныя ў гэтай поэме, адносяцца к часу 1890—1900 гадоў.*

*Якуб Колас».*

Трэцяе выданне «Новай зямлі» (1934) выйшла пад рэдакцыяй Л. Бэндэ. У адрозненне ад першага яно змяшчае ўступнае слова «Ад аўтара», датаванае 27 жніўня 1933 года, з разгорнутымі тлумачэннямі твора: «Сваімі вытокамі паэма зыходзіць з канца дзевятнаццатага стагоддзя, калі самаўладна-паліцэйская сістэма буяла ў поўнай сіле, калі ўсе прадушыны новым і свежым павевам думкі былі шчыльна пазамыканы, а па шмат якіх закутках Беларусі яшчэ захаваліся рэшткі прыгонніцтва».

Гэта адзін з довадаў, якія аўтар прывёў у якасці свайго вымушанага апраўдання. Сутнасць грамадскіх прэтэнзій, агучаных за папярэднія гады на адрас твора, выкладзена з самага пачатку прадмовы: «Паэма “Новая зямля” з яе асноўным мэтаімкненнем бясспрэчна гучыць дысанансам нашай эпосе, эпосе пабудовы соцыялізма, эпосе калектыўнай працы. Тэндэнцыі ўласніцтва, паложаныя ў аснову паэмы, асабліва выпінаюцца на фоне калгаснага будаўніцтва сёнешняга дня. Гэта акалічнасць прымушала і нашу крытыку, і наша выдавецтва, і нават, можа, і чытача ставіцца ў дачыненне да паэмы холадна і падазрона: ці патрэбна наогул паэма гэта ў нашы дні? ці ёсць сэнс выпускаць яе паўторным выданнем?»

Аўтар твора недвухсэнсоўна вызначае сваю пазіцыю: «Мне думаецца што ў аснове такіх запытанняў і такіх непрыязных адносін да паэмы ляжыць вялікае непаразуменне. Для таго, каб правільна ставіцца да паэмы, трэба прадставіць тую эпоху, помнікам і адбіткам якой з’яўляецца паэма “Новая зямля”».

Пісьменнік канстатуе, што сацыяльнае становішча Міхала, галоўнага героя ліра-эпічнага твора, — «становішча нявольніка і бяспраўнага чалавека». «Дзе ж шукаць гэтае выйсце?» — задаецца пытаннем аўтар прымяняльна да мінулай эпохі і прыводзіць словы «пануючага класа»: «Всякая душа власцем прыдзержашчым да павінуецца». І следам фіксуе наступную фразу, узятую таксама ў двукоссе: «Цярпі і без наракання знось свой крыж, сваю долю».

На мяжы XX—XXI стст. інтэрпрэтацыя «Новай зямлі» праз хрысціянскую традыцыю разгарнулася ў коласазнаўстве даволі шырока, і найперш у працах Уладзіміра Конана. Сёння ж не можа не выклікаць даследчыцкую ўвагу апеляванне ў 1933 годзе (паводле напісання прадмовы) да рэлігійных тэкстаў. І гэта ва ўмовах ваяўнічай антырэлігійнай палітыкі, прытым без агульнапрынятага сарказму або адкрытай з’едлівай крытыкі.

Першы выраз, скарыстаны пісьменнікам, узяты з Паслання апостала Паўла да рымлянаў (Рым. 13:1). Ён амаль поўнасцю супадае з тэкстам Елізавецінскай Бібліі, адзінае разыходжанне — Якуб Колас агучыў першую палову выслоўя. Паводле першакрыніцы: «Всякая душа властем предержащым да повинуется: несть бо власть аще не от Бога, сущыя же власти от Бога учинены суть». (Пераклад Святога Пісання на царкоўнаславянскую мову пабачыў свет у 1751 годзе, падчас праўлення імператрыцы Елізаветы Пятроўны. Дваццатае выданне было ажыццёўлена ў Маскве ў 1839 годзе.)

Другое выслоўе ўяўляе сабой вольны пераказ, беларускую інтэрпрэтацыю сутнасці біблійнага царкоўнаславянскага тэксту, у якім ідзе гаворка аб пакоры ўладам і выкананні запаведзяў.

«У набыцці ўласнага кавалка зямлі, у сваёй уласнай гаспадарцы бачыў Міхал сваё вызваленне, сваё выйсце з становішча панскага нявольніка. Гэта ідэя, ідэя сваёй зямлі, свайго ўласнага кутка, захоплівае яго цалкам, гэтай ідэі аддае ён сваё жыццё», — тлумачыць пісьменнік і рэфлексуе з пазіцый сучаснасці: «Але Міхал выбірае няправільны, фальшывы шлях свайго вызвалення — і ў гэтым яго вялікі і сапраўдны трагізм — уласны кавалак зямлі, свая гаспадарка, да якой з усёю палкасцю свайго сэрца імкнецца Міхал і ў якой бачыць ён сваё вызваленне, не могуць даць яму гэтай волі, гэтага вызвалення». Адсюль і аўтарская выснова: «Вось гэту акалічнасць трэба мець на ўвазе, падыходзячы да крытычнай ацэнкі “Новай зямлі”».

## З пасляваеннай адбудовы

З Акадэміяй навук БССР Якуб Колас непасрэдным чынам звязаны з канца 1920-х гадоў: акадэмік (1928), член Прэзідыума і віцэ-прэзідэнт (1929). Лагічная, а ў нашым выпадку і дакументальна пацверджаная, сувязь пісьменніка з акадэмічнай бібліятэкай.



*Тытульная старонка з дарчым надпісам Песняра.*

Падчас Вялікай Айчыннай вядучая навуковая кніжніца рэспублікі была разрабавана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Толькі ў 1957 годзе фонд бібліятэкі перасягнуў даваенны ўзровень.

Народны паэт перадаў выданне «Новай зямлі» (1934) і пакінуў на ім у 1950 годзе дарчы аўтограф:

*«Бібліятэцы Акадэміі Навук БССР Якуб Колас. 6.II.1950 г.».*

Такім чынам, перад намі адзін невялікі, але шаноўна-памятны эпізод у гісторыі ўзнаўлення даваенных кніжных збораў, дабрачынны жэст з боку класіка літаратуры.

Адрас Акадэміі навук у 1950-я гады — праспект Сталіна, 108. З 1948 да 1966 года кніжніца мела назву «Фундаментальная бібліятэка імя В. Р. Бялінскага», потым была перайменавана ў гонар Якуба Коласа (сучасная назва — Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі). У пачатку 1950-х гадоў, пра які ідзе гаворка, акадэмічная бібліятэка размяшчалася па адрасе: вул. Пушкіна, 56 (цяпер праспект Незалежнасці, 66). Асобны будынак па вул. Сурганава, 15 вядучая навуковая кніжніца рэспублікі атрымала ў 1967 годзе.

У «Новай зямлі» (1934) была супервокладка, якая, на жаль, не захавалася пасля выпрабаванняў часу на экзэмпляры, што трапіў у ЦНБ, але яе можна пабачыць на выставе ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа, прымеркаванай да 100-годдзя паэмы. Імя мастака В. Шульца не засведчана ў даведачных выданнях. Пакуль удалося выявіць толькі інфармацыю пра ўдзел творцы ў Першай выстаўцы мастацкага афармлення кнігі ў Мінску (1934), прысвечанай 10-годдзю з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага выдавецтва.

Экзэмпляр «Новай зямлі» з дарчым аўтографам аўтара змяшчае яшчэ адну немалаважную пазнаку часу, мастацтва і культуры шанавання кнігі — экслібрыс на другой старонцы вокладкі з тэкстам: «*Ex libris* ФБ АН. Аддзел рэдкай кнігі. Беларуска». Створаны ў 1964 годзе аддзел рэдкіх кніг стаў другім структурным падраздзяленнем такога кшталту ў бібліятэчнай практыцы рэспублікі.

Такім чынам, зварот да канкрэтнага выдання, актуалізаваны сёлетнім юбілеем паэмы, можа стаць трыгерам комплекснага даследавання, звязанага з гісторыяй літаратурнай крытыкі, кніжнай ілюстрацыі, а таксама ўзаемадачыненняў класіка з вядучай навуковай бібліятэкай Беларусі.

**Мікола ТРУС,**
**кандыдат філалагічных навук**
**Ілюстрацыя даслана аўтарам**

# Ад «Лясных тынкоўшчыкаў» пачатак

**Бярэзіншчына — унікальная старонка нашай Радзімы. Прыгожая сваімі лясамі, якія займаюць палову тэрыторыі раёна. Прыгожая рэкамі, сярод якіх і Бярэзіна. Прыгожая назвамі паселішчаў — Багушэвічы, Сяліба, Дзмітравічы, Дзямешкава, Дулебы, Жорнаўка, Заброддзе, Каменны Барок… Бярэзінская зямля выпеставала шмат талентаў.**

Сярод іменаў пісьменнікаў, чые лёсы атаясамліваюцца з Бярэзіншчынай, — празаік Рыгор Ігнаценка. І хаця нарадзіўся ён на Магілёўшчыне, у вёсцы Вусаўка Касцюковіцкага раёна, большая частка яго жыцця звязана якраз з Бярэзіншчынай. З 1956 года Рыгор Канстанцінавіч — жыхар вёскі Паплавы. У 1957—1980 гадах ён працаваў настаўнікам музыкі ў Паплаўскай сярэдняй школе. У 1964 годзе ў выдавецтве «Беларусь» выйшаў першы зборнік апавяданняў Рыгора Ігнаценкі — «Лясныя тынкоўшчыкі». І праз увесь свой творчы


*Рыгор Ігнаценка.*

шлях літаратар, якога па праву можна назваць пісьменнікам-прыродазнаўцам, расказвае юнаму чытачу пра адметнасці роднай прыроды, пра сустрэчы і адкрыцці ў лесе, на беразе ракі, у ваколіцах родных паселішчаў. Да чытача ў розныя гады прыйшло нямала кніг Рыгора Ігнаценкі. Апошняя з іх па часе — «Зацугляны шчупак», што пабачыла свет у 2009 годзе ў выдавецтве «Літаратура і мастацтва». У цвёрдай вокладцы, аб’ёмам у 144 старонкі, з прыгожым мастацкім афармленнем, яна даволі хутка разышлася па бібліятэках, не знойдзеш яе зараз і ў кнігарнях. І з таго часу ніводнае з выдавецтваў, на вялікі жаль, не звярнулася да творчасці Рыгора Ігнаценкі — уважлівага, чуйнага да прыроды мастака слова. Будзем спадзявацца, што змены ўсё ж адбудуцца і ў адносінах да такой прыродазнаўчай тэматыкі ў беларускай дзіцячай літаратуры, як і непасрэдна да творчасці Рыгора Ігнаценкі, усё наладзіцца лепшым чынам.

А пакуль у фондах бібліятэк Бярэзінскага раёна, найперш у Бярэзінскай раённай цэнтральнай бібліятэцы, ёсць дзве тоненькіх кніжачкі, якія мясцовыя бібліятэкары выдалі саматужна. Адна з іх выпушчана ў 2012 годзе — «Зялёнае рэха». Укладзена намаганнямі В. Наскавец, бібліятэкара Паплаўскай сельскай бібліятэкі. Рэдактарам кніжачкі выступіла Т. Круталевіч, камп’ютарны набор ажыццявілі В. Наскавец і А. Ждановіч. Мастацкае афармленне і камп’ютарная вёрстка належаць Н. Маеўскай. Тыраж выдання ў 28 старонак склаў 30 экзэмпляраў. Другая кніжачка — зборнік апавяданняў «Зачараванне прыродай», які пабачыў свет у 2018 годзе.

У «Зялёнае рэха» ўвайшлі наступныя творы: «Наш мосцік», «Дарагі букет», «Шапка», «У спёку», «Запознены ліст», «Надыход зімы» і іншыя. Займальныя сюжэты, лаканічна выпісаныя яркія малюнкі прыроды дазваляюць чытачам выправіцца ў падарожжа па родных ваколіцах разам з пісьменнікам, які натхнёна перадае сваё ўласнае любаванне прыродай. Рыгор Ігнаценка вучыць любові да ўсіх жывых істот, насычае свядомасць юных чытачоў ведамі, якія сам атрымаў непасрэдна пры сустрэчах з лесам, рэкамі і азёрамі. І ўся кніга, і кожны твор паасобку маюць вялікае выхаваўчае значэнне. Зборнікамі можна карыстацца ў пачатковай школе, іх варта адкрыць настаўнікам, якія выкладаюць не толькі беларускую літаратуру, але і геаграфію. Колькі адкрыццяў дораць апавяданні Рыгора Ігнаценкі!..

Нізкі паклон аўтару, які шчодра, па-мастацку выверана, захапляльна ўзбагачае чытача не проста ведамі аб роднай прыродзе, а дапамагае спасцігаць сутнасць характа, разумець жыццё птушак, звяроў, вартасці кожнай травінкі і дрэва! Нізкі паклон бібліятэкарам, якія ў сваёй штодзённай працы заўважаюць сапраўднае, дадаюць да свядомасці чытачоў імёны і творы вартых увагі цікавых аўтараў, не абмяжоўваюцца прапагандай вядомых і, безумоўна, яркіх пісьменнікаў-прыродазнаўцаў В. Біянкі, Б. Жыткова, М. Прышвіна, Г. Скрабіцкага, В. Чаплінай, В. Вольскага, У. Дубоўкі.

…Для ахвотных чытачоў, хто яшчэ не знаёмы з творчасцю Рыгора Ігнаценкі, нагадаем назвы яго ранейшых кніг: «Урок у лесе», «Ластаўчына затока», «На заечых сцежках», «Дзе матылькі зімуюць», «Бярозавы шэпт», «Карабель вясны», «У зімовым садку».

**Кастусь ЛЕШНІЦА**

# Удумлівы аналітык і палеміст

**Крытык, літаратуразнавец, фалькларыст, журналіст і публіцыст Сцяпан Майхровіч хоць і не мае розных званняў, але яго называлі «вельмі таленавітым», «адным з першапраходцаў даследавання гісторыі беларускай літаратуры», арыгінальным біёграфам Францыска Скарыны, класікаў беларускай літаратуры XIX—XX стагоддзяў. Не страцілі сваёй каштоўнасці яго працы «Нарысы беларускай літаратуры XIX стагоддзя», «Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XIV—XVIII стст.», «Иван Фёдоров и белорусское книгопечатание», «Слова аб палку Ігаравым», работа «Беларускія парадыйныя паэмы "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе"», гістарычны нарыс «Прыказкі і прымаўкі».**

Малая радзіма Сцяпана Казіміравіча — пасёлак Старэва ці пераншыга Слуцкага раёна. Нарадзіўся ён у польскай сям'і выдзімальшчыка шкла. З 1915 года, калі бацька знаходзіўся на адным з франтоў Першай сусветнай вайны, 13 гадоў працаваў на гуце, быў інструктарам Бабруйскага акруговага камітэта камсамола, а ў 1930 годзе паступіў на рабфак пры Маскоўскім універсітэце. Пасля сканчэння яго вучыўся ў Маскоўскім інстытуце журналістыкі імя «Праўды».

Другакурснікам Сцяпана камандзіравалі ў Беларусь. Працаваў радактарам Камарынскай раённай газеты, загадчыкам сектара Белдзяржвыдавецтва, быў рэдактарам польскіх газет, якія выдаваліся ў БССР, — «*Orka*» («Ворыва») і «*Sztandar Wolności*» («Сцяг свабоды»). Адначасова вучыўся на завочным аддзяленні Мінскага педінстытута імя М. Горкага, які скончыў у 1941 годзе.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны добраахвотна пайшоў на фронт. Старшым інструктарам палітаддзела 10-й арміі Заходняга фронту ўдзельнічаў у абароне Масквы. Адкліканы ЦК Кампартыі Беларусі, стаў галоўным рэдактарам Цэнтральнага беларускага радыёвяшчання (1941—1943). З жніўня 1943 года па асабістай просьбе быў накіраваны ў тыл да партызан. З'яўляўся членам кіраўніцтва падпольнага і партызанскага руху ў Беластоцкай вобласці. Рэдагаваў газету «Белостокская правда», з 23 лістапада 1943 года — член Беластоцкага падпольнага абкама КП(б)Б.

У трэцім томе трохтомніка «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны» ёсць такія радкі: «В организации и проведении идейно-политической работы среди партизан и населения (гаворка аб падзеях 1944 года. — **Э. І.**) деятельное участие принимали секретари и члены подпольных обкомов и райкомов партии, комиссары отрядов и бригад, тысячи коммунистов и комсомольцев. В том числе Д. М. Армянинов, А. Т. Михайловский, С. К. Майхрович, С. Ф. Потеруха, Г. П. Стешиц, Д. К. Сукачёв, В. А. Титовец, А. К. Андреев, П. А. Железнякович, Г. Н. Машков, А. И. Степанова, Н. С. Степанов и другие».

Пасля вызвалення Беларусі Сцяпан Майхровіч працаваў дырэктарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР, журналістам, галоўным рэдактарам Вучэбна-педагагічнага выдавецтва БССР. У 1957 годзе скончыў аспірантуру пры Мінскім педінстытуце імя М. Горкага, а ў 1959 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю. Быў старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1930 годзе, а першая навуковая публікацыя — артыкул «Максім Адамавіч Багдановіч» — з'явілася ў 1945 годзе. Яна і зараз не страціла сваёй каштоўнасці.

Калегі Сцяпана Майхровіча па Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору і Інстытуце беларускай літаратуры АН БССР па многіх пытаннях лічылі яго першапраходцам. Вялікае значэнне надавалі ягонай кнізе «Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць» (1958). У прадмове да яе Сцяпан Казіміравіч падкрэсліў:

«…Пісьменнік-дэмакрат, пясняр народнай нядолі, ён у сваіх творах на грамадска-палітычныя тэмы быў палымяным прапагандыстам вызвалення народа з-пад прыгнёту царызму.

Максім Багдановіч як паэт сфарміраваўся пад непасрэдным уплывам вуснай паэзіі беларускага народа і рускай класічнай літаратуры. Ён пакінуў глыбокі след у гісторыі беларускай мастацкай літаратуры і перадавой публіцыстычнай думкі пачатку ХХ стагоддзя. Паэт пражыў нядоўга — крыху больш дваццаці пяці год. Яшчэ больш кароткім быў яго творчы шлях. Тым не менш ён пакінуў у спадчыну свайму народу багатыя мастацкія каштоўнасці. Не выпадкова імя аўтара "Вянка" ў гісторыі беларускай літаратуры стаіць побач з імёнамі такіх волатаў паэзіі, як Янка Купала і Якуб Колас.

Максім Багдановіч — паэт народны…

Наватарская дзейнасць паэта, тэарэтыка літаратуры і публіцыста, выходзіць далёка за межы свайго часу, з'яўляючыся каштоўным укладам у духоўную скарбніцу беларускага народа».

У гутарцы з аўтарам гэтых радкоў Алесь Бачыла, які напісаў нарыс «Дарогамі Максіма» (1971), і вядомая даследчыца жыцця і творчасці Максіма Багдановіча, складальнік зборніка ўспамінаў і біяграфічных матэрыялаў «Шлях паэта» (1975) Ніна Ватацы высока ацэньвалі працы Сцяпана Майхровіча па біяграфіі і творчай спадчыне Максіма Багдановіча.

У 1952 годзе выйшла першая манаграфія Сцяпана Майхровіча «Янка Лучына: Жыццё і творчасць», праз пяць гадоў — «Нарысы беларускай літаратуры XIX стагоддзя». Адзін з самых аўтарытэтных беларускіх літаратуразнаўцаў Сцяпан Александровіч, які потым стаў доктарам філалагічных навук, прафесарам БДУ, справядліва канстатаваў:

«Літаратуразнаўца Сцяпан Майхровіч многа і плённа працуе ў галіне вывучэння здабыткаў беларускай літаратуры XIX стагоддзя…

Як і папярэднія даследаванні С. Майхровіча, "Нарысы" вызначаюцца багаццем сабранага фактычнага матэрыялу, імкненнем грунтоўна даследаваць і прасачыць змест гэтага важнага перыяду ў гісторыі грамадскай думкі Беларусі. Аўтар ідзе сваёй дарогаю — пераглядае і пераацэньвае творчасць паасобных пісьменнікаў, робіць цікавыя вывады і назіранні».



*Сцяпан Майхровіч.*

Шэраг беларускіх мовазнаўцаў лічылі Сцяпана Майхровіча плённым «скарыназнаўцам». Так, Уладзімір Анічэнка ў рэцэнзіі на яго кнігу «Георгій (так тады пісалі. — **Э. І.**) Скарына» (1966) акцэнтаваў увагу на тым, што «гэта карысная навукова-папулярная праца, у якой аўтар зрабіў сістэматызацыю і абагульняючы выклад вядомых і малавядомых звестак з жыцця і дзейнасці слаўнага сына нашага народа…




*Калаж Святланы Таргонскай.*

Увогуле кніга Майхровіча павінна быць ацэнена станоўча. Багата ілюстраваная праца "Георгій Скарына" з прыхільнасцю будзе сустрэчана чытачамі».

Хоць пасля выхаду ў свет кнігі Сцяпана Казіміравіча «Слова аб палку Ігаравым» (1968) прайшло столькі часу, нягледзячы на выданне пасля гэтага ў СССР і ў Беларусі ўнікальнай літаратуры па дадзеным пытанні, яна ў цэлым не страціла сваёй каштоўнасці і сёння.

Апантаны беларускі даследчык, фалькларыст, літаратуразнавец і крытык Іван Цішчанка меў усе падставы для наступнай ацэнкі:

«…Даследчык, аднак, не проста дбайны збіральнік чужых думак. Ён і ўдумлівы аналітык, і палеміст, асабліва калі гаворка заходзіць аб ідэйна-сацыялагічнай ацэнцы "Слова", аб метадалагічным падыходзе да "Слова" таго ці іншага даследчыка…

Адчуваецца, што С. Майхровіч, даследуючы мастацкія фактуры "Слова", апрача спецыяльнай літаратуры, дасканала вывучыў эпоху, якая адлюстравана ў гэтым творы, лёгка арыентуецца ў матэрыяле, заўважае нават самыя дробныя хібы ці недакладнасці ў працах папярэдніх даследчыкаў».

Амаль усё жыццё Сцяпана Майхровіча хвалявалі пытанні фальклору, вуснай народнай творчасці. У 1976 годзе быў апублікаваны гістарычны нарыс «Прыказкі і прымаўкі», прысвечаны даследаванню моўнай творчасці народа з часоў фарміравання беларускай народнасці да нашых дзён. Разам з тым у гэтай кніжцы даецца азначэнне прыказкавага жанру як тыповай формы афарыстычнага мыслення філасофскімі катэгорыямі.

Беларускі даследчык Васіль Скідан, рэцэнзуючы гэтую работу, акцэнтаваў увагу чытачоў на такіх момантах:

«Аўтар кніжкі "Прыказкі і прымаўкі" Сцяпан Майхровіч — вядомы літаратуразнаўца, фалькларыст, добра ведае народнае жыццё, шмат сілы і часу патраціў на вывучэнне аблюбаванага жанру. Творчае гарэнне даследчыка, яго роздумы і назіранні выліліся ў зладжаную канцэпцыю…

Змястоўны раздзел — "Прыказкі беларускага народа". Заканчваецца даследаванне сённяшнім днём. Перад намі прыказкі і выслоўі, створаныя сучаснікамі».

За год да сваёй смерці (памёр 2 ліпеня 1981 года) Сцяпан Казіміравіч паспеў выдаць арыгінальную манаграфію «Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XIV—XVIII стст.». Яна ўяўляла сабой даследаванне развіцця беларускай літаратуры гэтага перыяду, у аснову якога пакладзены багаты фактычны матэрыял вучоных-папярэднікаў, якім быў блізкі лёс старажытнай беларускай літаратуры, даследаваннямі якой займаліся, пачынаючы ад Яўхіма Карскага, Максіма Гарэцкага і інш.

У чытача можа скласціся ўражанне, што Сцяпан Майхровіч быў летапісцам мінулых стагоддзяў і яго не цікавіла сучасная беларуская літаратура. Але гэта не так. Менавіта яму належыць аўтарства дзвюх кніг аб народных пісьменніках Беларусі Іване Шамякіне і Янку Брылю.

У кнізе «Янка Брыль. Жыццё і творчасць» (1961) Сцяпан Казіміравіч прасачыў, якімі дарогамі ішоў малады пісьменнік ва ўмовах панскай Польшчы, паказаў росквіт яго ў пасляваенныя гады ў Савецкай Беларусі. На аснове шырокага разгляду прозы асветлены творчы рост Івана Антонавіча і спецыфічныя асаблівасці яго творчага даравання.

Што тычыцца нарыса аб жыцці і творчасці Івана Шамякіна (1978), то, як вядома, пасля выхаду яго выйшлі кнігі такіх вядомых літаратуразнаўцаў, як Аляксей Гардзіцкі, Віктар Каваленка і інш. Але даследаванне Сцяпана Майхровіча, нягледзячы на некаторыя недахопы, стала першым з прысвечаных аднаму з самых таленавітых пісьменнікаў Беларусі. У раздзеле «Сэрца на далоні» ёсць такія радкі:

«Не так ужо багата, напэўна, знойдзецца ў сучаснай беларускай літаратуры твораў, роўных па глыбіні адлюстравання жыцця "Сэрцу на далоні" Івана Шамякіна…

Глыбока зазірнуў аўтар "Сэрца на далоні" ў сацыяльную біяграфію народа, у яго душы і імкненні».

Аналіз мастакоўскай спадчыны Сцяпана Майхровіча дае падставу для высновы, што ў яго асобе беларуская культура і асабліва літаратура страцілі вельмі таленавітага і арыгінальнага даследчыка, якія ўзбагацілі іх сваімі творамі.

**Эмануіл ІОФЕ**

# Займальныя задачкі

**Убачыць творы мастакоў розных пакаленняў можна ў галоўным корпусе Нацыянальнага мастацкага музея да 17 верасня. На выстаўцы «Плынь часу» дэманструюцца выбраныя работы сёлетніх юбіляраў. З таго, на што раяць звярнуць увагу арганізатары экспазіцыі, — час, калі ствараўся той ці іншы твор, і што імкнуліся перадаць мастакі пэўнага перыяду, як інтэрпрэтавалі рэальнасць. Экспазіцыя атрымалася надзвычай багатая — у ёй прысутнічаюць, напрыклад, і пейзажы Віталя Цвіркі, і партрэты Нінэлі Шчаснай, і тэматычныя карціны Аляксандра Кішчанкі, і паўабстракцыі Мікалая Бушчыка. А гэта толькі жывапіс! Яшчэ ў экспазіцыю ўвайшлі скульптуры і творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва… Спросцім віртуальную вандроўку: чытачам «ЛіМа» гэтым разам прапануем бліжэй пазнаёміцца з творчасцю трох выбраных аўтараў.**

*Дзмітрый Камароў (Комар) (1883—1970; месца нараджэння — вёска Латонава Мацвеева-Курганскага раёна Растоўскай вобласці).* Творчасць малавядомага сёння аўтара, дарэчы, аднакашніка Валянціна Волкава, па прапанове якога ён прыехаў у Беларусь і выкладаў у Віцебску і Мінску, прадстаўлена невялічкімі палотнамі. Яго індустрыяльныя пейзажы, напрыклад, «Доменны цэх, Ліцейны двор» (1920) і «Шахта і пад'язныя шляхі» (1930), — важныя сведчанні эпохі. Гэта нязмрочныя, цёплыя работы, у якіх адсутнічаюць матывы супрацьстаяння з прыродай і часам непасільнай


*Работы Зінаіды Астаповіч і Дзмітрыя Камарова ў экспазіцыі.*

працы. Толькі натхненне і надзея… Нягледзячы на тое, што ў сацрэалістычных пейзажах важны быў маштаб, выбраныя карціны Дзмітрыя Камарова лаканічныя і камерныя. Да таго ж ніводная не знаёміць з героем-працаўніком, дынаміка ледзь адчувальная. Магчыма, падобныя творы ёсць у многіх мэтраў сацрэалізму, толькі такія спробы ніколі не былі ў цэнтры ўвагі.


*Юрый Гаўрын «Вечар», 2006 г.*

Сёння іншая справа — айчыннае даваеннае мастацтва выклікае асаблівы інтарэс аматараў і даследчыкаў у любым выглядзе. Дарэчы, аўтар цікавы і ўдалымі мініяцюрнымі прыродна-архітэктурнымі пейзажамі («Пейзаж з сажалкай і лесам» (1917), «Пейзаж з царквою» (1920), «Гарадская ўскраіна ўзімку» (1927), «Пейзаж з месяцам» (прыкладна 1950-я)).

*Юрый Гаўрын (1943—2016; нарадзіўся ў пасёлку Зіядзін Пахтачыйскага раёна Самаркандскай вобласці).* У творчасці гэтага мастака адчуваецца ўплыў самых розных плыняў і кірункаў. У сталым узросце творца звярнуўся да філасофскага пейзажу, праз які прыслухоўваўся да прыроды і шукаў гармонію са светам. Агністы «Вечар» (2006) Юрыя Гаўрына пераносіць у іншае вымярэнне: там ёсць месца рэальнасці, аднак з цягам часу яна плавіцца, нібы падатлівы метал, расцякаецца, нібы неўтаймаваная рака… Адшукаць у гэткім калейдаскопе праўду, чужую і сваю, становіцца задачай з зорачкай. Але праз тое не меней займальнай.

*Алег Скавародка (нарадзіўся ў 1948 годзе ў вёсцы Асьё Лепельскага раёна Віцебскай вобласці).* Многія, хто знаёмы з творчасцю сучаснага майстра, цэняць яго найперш за адметнае бачанне формы і колеру. Менавіта яны — сведчанні свежасці і непаўторнасці (хоць на выстаўцы да ліку калег Алега Скавародкі можна аднесці, напрыклад, Мікалая Бушчыка і Алеся Цыркунова — яны таксама перадаюць эмацыянальнасць, узвышанасць падобнымі сродкамі). З-за таго, што стваральнікі экспазіцыі імкнуліся паказаць


*Алег Скавародка «Зямля Васіля Быкава», 2004 г.*

творчасць як мага большай колькасці мастакоў-юбіляраў, мы маем магчымасць убачыць у сярэднім 2—3 працы кожнага. Што тычыцца Алега Скавародкі, то гэта «Велікодныя званы» (1991), а таксама адна з найбольш яркіх карцін на выстаўцы — «Зямля Васіля Быкава», створаная ў 2004 годзе, хутчэй за ўсё на пленэры, якім аддае перавагу жывапісец. Што ні кажы, нават улічваючы палітру Алега Скавародкі, здзіўляешся і колераваму рашэнню, і выбранай кампазіцыі, і асэнсаванню знаёмага сюжэта. Жыццё і творчасць народнага пісьменніка зазвычай схіляюць да сумных роздумаў. Але Бычкі — краіна дзяцінства Васіля Быкава — працягваюцьззяць і пераліваюцца на палатне.


*Валянцін Губараў «Нацыянальны мастацкі музей», 2021 г.*

*P. S.* Сярод сур'ёзных карцін таленавітых сучаснікаў і майстроў, якія даўно пайшлі з жыцця, сярод такіх усё ж задаўненых работ, якія даюць падставу паразважаць пра мінулае краіны і лёс нацыянальнай мастацкай школы, размясцілася «звонкая-яркая-вясёлая» кампазіцыя Валянціна Губарава «Нацыянальны мастацкі музей» (2021). Калі б не аўтарскі смех, калі б не пяшчота, з якой мастак глядзіць на чалавека, то пройдзеш і не заўважыш, як мала гумару побач з намі, як рэдка мы смяёмся, нават калі ёсць нагода.

**Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара**

# Адшукаць той самы час

**Каб паказаць, чым жыве айчыннае мастацтва і на што скіравана ўвага галерэйшчыкаў і музейшчыкаў, «ЛіМ» імкнецца асвятліць як мага болей праектаў і імпрэз вядучых выставачных пляцовак сталіцы. Аднак нельга абыходзіць бокам і менш славутыя экспазіцыйныя прасторы. Расказваем, што адбываецца ў невялічкіх, хоць і адметных галерэях Мінска.**

Выстаўка маладога мастака з Гомеля Андрэя Пічушкіна *«Cartoon for adults»* працуе ў *A&V Art Gallery.* Аўтар скончыў Гомельскі мастацкі каледж і сёння займаецца жывапісам, удзельнічае ў разнастайных выстаўках і фестывалях. Пазіцыянуе сябе як эксперыментатара з тэхнікамі і матэрыяламі, шукальніка нечаканых перспектыў для традыцыйнага жывапісу. Творчасць Андрэя Пічушкіна прываблівае яркасцю фарбаў, дынамікай сюжэтаў, іранічным зместам. Як і многія сучасныя мастакі, ён імкнецца прыўнесці ў мастацтва экспрэсію, такім чынам знаёміць гледача з уласным бачаннем асаблівасцей нашага часу. Яго памочнікі ў гэтым — незвычайныя сюжэты і нетыповыя вобразы, якія, аднак, складваюцца ў гарманічныя кампазіцыі.

А ў мастацкай галерэі *VILNIUS* сталічнай бібліятэкі № 18 можна ўбачыць творы Андрэя Ждановіча, аб'яднаныя ў персанальную выстаўку «Беларускі пейзаж». Жанр аблюбаваны аўтарам, мастак на працягу доўгага часу вельмі плённа працуе з тэмай. Між тым гледачу прадстаўлены работы, якія раней не выстаўляліся. Перыяд іх стварэння — 2020—2022 гады.


*Андрэй Пічушкін «15 APR», 2023 г.*

Жывапісец і акварэліст Андрэй Ждановіч шмат падарожнічае па Беларусі, таму імкнецца перадаць не толькі прыгажосць беларускай прыроды, але і яе адметнасці, якія мы перасталі заўважаць, яе асаблівы настрой, які неверагодна цяжка перанесці на паперу ці палатно.

Тым часам у Арт-гасцёўні «Высокае мЕста» адкрылася выстаўка Юрыя Несцерука «Ад блакіту да чорнага», падрыхтаваная сумесна з Беларускім саюзам мастакоў. У экспазіцыі — больш за 25 манументальных твораў магілёўскага мастака з дзвюх серый пад назвамі «Рыбны дзень» і «Вясковы супрэматызм». Між сабой серыі абсалютна розныя — адчуваецца, што створаны ў розныя перыяды жыцця. Як адзначае мастацтвазнаўца Святлана Строгіна, выстаўка адлюстроўвае вечны пошук новых формаў, гульню з прасторай і колерам, нястомнае жаданне зразумець сутнасць рэчаў, якія акружаюць нас у звычайным жыцці. Аднак галоўнае, пра што разважае мастак, — паняцце часу і яго ўспрымання. Развагі гэтыя Юрый Несцярук імкнецца давесці з дапамогай нярэдка абсалютна процілеглых кірункаў мастацтва, напрыклад, абстракцыі і супрэматызму.

Завяршаем сціплы агляд імёнамі класікаў. Днямі ў Галерэі мастацтваў Леаніда Шчамялёва адбылося адкрыццё выстаўкі жывапісу «Сімфонія фарбаў» Леаніда Шчамялёва, прымеркаванай да яго 100-годдзя. Дэманструюцца карціны з калекцыі сям'і народнага мастака Беларусі: нацюрморты, партрэты родных і блізкіх, пейзажы. З сюжэтаў экспазіцыі відавочна, што галоўнай крыніцай натхнення для Леаніда Дзмітрыевіча была яго сям'я, а галоўнымі музамі заставаліся жонка і дочкі. Аднак арганізатары, апроч іншага, імкнуліся паказаць уласцівае мастаку надзвычай тонкае адчуванне колеру, яго майстэрскае валоданне палітрай.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

# Антаніна КАРПІЛАВА:

# «Кіно не магло абысці ўвагай літаратуру з такім узроўнем драматызму і глыбіні»

**Беларускае кіно набліжаецца да свайго 100-годдзя, і на шляху да гэтай даты хочацца зразумець, у чым яно было асаблівае, як напрацоўвала сабе імідж. І калі спытаць, якая галоўная тэма беларускага кіно за стагоддзе, усе назавуць яе, не задумваючыся. Невыпадкова нашу кінастудыю звязваюць з фільмамі пра вайну: яны шмат у чым вызначылі лёс айчыннага кіно на этапе савецкай гісторыі. Ды і ў постсавецкі перыяд «Беларусьфільм» працягвалі звязваць з гэтай тэмай. Яна стала адной з галоўных для нас, таму што беларускі народ да гэтага часу адчувае боль ад каласальных страт і перажытых трагедый. А яшчэ таму, што былі тыя, хто іх адчуў на сабе і расказаў пра гэта на старонках кніг, якія сталі падмуркам для стварэння фільмаў.**

## Феномен Быкава

Адным з аўтараў, чые творы актыўна экранізаваліся за савецкім часам (і не толькі ў Беларусі!), быў Васіль Быкаў. Беларускае кіно і Быкаў — аднагодкі. Пачаўшы адваротны адлік да юбілею, хочацца зразумець, што было важна ў чалавечым досведзе пісьменніка для айчынных рэжысёраў — аўтараў фільмаў, якія, па сутнасці, не страцілі сваёй актуальнасці і сёння.

Нашы кіназнаўцы даследавалі гэты феномен. Ужо ў XXI стагоддзі ўбачыў свет зборнік навуковых прац «Вялікая Айчынная вайна ў кінамастацтве Беларусі» пад рэдакцыяй Антаніны Карпілавай, загадчыцы аддзела экранных мастацтваў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук. З ёй мы гаворым пра лепшыя экранізацыі аповесцяў пісьменніка, якія ўвайшлі ў гісторыю беларускага кіно.

## На хвалях памяці

— Калі разглядаць унёсак беларускай культуры XX стагоддзя ў сусветную скарбонку, то трэба спыніцца на некалькіх мастацкіх з'явах. Гэта «Песняры», якія праславіліся не толькі ў Беларусі, у Савецкім Саюзе, але і ў Амерыцы — іх называлі беларускімі «Бітлз». Гэта бліскучы харэограф Валянцін Елізар'еў, які зараз з'яўляецца мастацкім кіраўніком тэатра оперы і балета Беларусі. У літаратуры ёсць некалькі знакавых пісьменнікаў, якія паставілі пытанні аб шляхах развіцця беларускага этнасу і народа: Ян Баршчэўскі, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч. З бліжэйшых да нашага часу — вядома, Васіль Быкаў і Уладзімір Караткевіч. Але Быкаў — асаблівая з'ява ў беларускай літаратуры савецкага перыяду, таму што ён асэнсоўваў надзвычай цяжкую для рэспублікі і ўсяго свету тэму і здолеў у ёй гаварыць з чалавекам вельмі даверліва і глыбока. Невыпадкова яго проза была перакладзена на мноства моў: вайна суправаджала чалавецтва на розных этапах развіцця і не сышла ў нябыт нават пасля разбурэнняў, выкліканых Другой сусветнай. Людзі не зрабілі неабходных высноў, таму заклік да чалавечнасці застаецца актуальным нават зараз, а прадчуванні і прагнозы пісьменніка-франтавіка распаўсюджваюцца і на XXI стагоддзе.



*Калаж часопіса «На экранах».*


*Кадр з фільма «Альпійская балада».*

Проза Быкава — гэта асобны Сусвет. Шмат чаго нам яшчэ трэба ўсвядоміць не толькі ў дачыненні да Беларусі, але і ў частцы яго прароцкіх прагнозаў наконт будучыні чалавечага свету наогул. Васіль Быкаў абапіраўся ў сваіх творах на экзістэнцыйную філасофію Камю, Сартра і іншых пісьменнікаў, якія ўзнімалі вечныя, ці «апошнія», пытанні быцця. Быкаў засяродзіўся на вастрыні экстрэмальных сітуацый XX стагоддзя. І гэта зразумела: ваяваў, родным паведамілі пра ягоную гібель, але ён атрымаў шанц. У філасофіі Камю і Сартра момант выпадковасці і шанцу вельмі важны. І гэта закладзена ў творах Васіля Уладзіміравіча. Ён верыў у шанц, які дае чалавеку лёс, хоць і не быў вернікам у тым сэнсе, які звычайна ўкладваецца ў гэтае слова. Але ў некаторых яго творах можна знайсці зварот да малітваў і ікон, пры тым, што сам ён быў чалавекам іншага духоўнага кіравання, яго светаадчуванне вызначылі перажытыя трагічныя ваенныя падзеі.

Я чалавек рускі, нарадзілася ў Мардовіі, вырасла ў Полацку. І заўжды ведала імя Быкава як аднаго з тых людзей, якія ўплываюць на працэс самаідэнтыфікацыі нацыі, пры тым, што яго творчасць разглядалася ў кантэксце савецкай гісторыі. Але тут не ўсё так проста. Калі звярнуцца да пантэона вялікіх зорак беларускай літаратуры — Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Якуба Коласа, — іх творчасць звязваюць з архетыпам неба і зямлі. Быкаў падключаецца да гэтага пантэона, але што стаіць за ім? Я думаю, што гэта зорка нейкага падземнага — ці падсвядомага — свету. Прыйшоўшы ў беларускую літаратуру пасля многіх важных для народа пісьменнікаў, ён па сутнасці працягваў іх шлях, але даследаваў не верхнія пласты свядомасці, а капаў углыб. Кіно не магло абысці ўвагай літаратуру з такім узроўнем драматызму і глыбіні. Невыпадкова ў нас слаўная гісторыя экранізацый Быкава менавіта беларускімі рэжысёрамі.

## Першая хваля: гранічная сумленнасць

— Зварот да прозы Быкава ў кіно я б падзяліла на некалькі этапаў. У пачатку 60-х адбылося адкрыццё Быкава для кіно — і пайшла плынь экранізацый. У 1963-м выйшаў адзін з маіх любімых фільмаў — «Трэцяя ракета» Рычарда Віктарава. Да гэтага часу памятаю чорна-белую стылістыку — жорсткую, у нечым тэатральную, дзе раскрываюцца лёсы некалькіх чалавек, якія апынуліся ў адным акопе. Адсюль пайшло паняцце «акопная праўда». У фільме няма дадатковых выразных сродкаў, у прыватнасці, музыкі, але для мяне да гэтага часу ён з'яўляецца камертонам прозы ў экранным выяўленні: ён выклікае магутную эмоцыю.

Пасля адкрыліся іншыя шлюзы быкаўскай творчасці, узнікла нават рамантычная інтанацыя: у цэнтры сюжэта «Альпійскай балады» знаходзіцца каханне. Праўда, у Быкава любое выказванне суправаджаецца сур'ёзнымі рэтраспекцыямі — гэта характэрная рыса яго прозы, у якой заўсёды ёсць успаміны герояў, як і ў аповесці «Альпійская балада». На жаль, кіно пагрэбавала гэтым, атрымалася рамантычная драма з-за таго, што Іван пазбавіўся ўспамінаў аб перадваенным жыцці. Але рэжысёр Барыс Сцяпанаў меў на гэта права, і ў свой час карціна атрымала неверагодны рэзананс. Насамрэч гледачу цяжка ўспрымаць нелінейнае апавяданне, калі ёсць звароты да мінулага, да будучыні. Вядома, Станіслаў Любшын і Любоў Румянцава адыгралі выдатна ў рэжысёрскім увасабленні аповесці — гэтая інтэрпрэтацыя сапраўды вельмі складаная.

Творчасць Быкава невыпадкова была вельмі запатрабаванай у кіно, бо глядзела ў глыбіню. Гэта давала рэжысёрам магчымасць паказаць чалавечыя драмы, якія спарадзіла вайна. Нават у «кароткім метры», як у фільме «Пастка» Леаніда Мартынюка. Але ў адзін шэраг з «Трэцяй ракетай» Віктарава (які зняў яшчэ «Абеліск») я б паставіла фільм «Воўчая зграя» Барыса Сцяпанава. Некалькі чалавек едуць на возе ў партызанскі лагер і праходзяць праз усе архетыповыя выпрабаванні — лес, балота, вада, пажар… Па іх слядах ідуць фашысты, выяўляючы сваю звярыную сутнасць. Фільм, магчыма, не зусім адбыўся, калі яго разглядаць з пункту гледжання кінамастацтва, але Сцяпанаў паспрабаваў наблізіцца да глыбінных, можна нават сказаць — антычных асноў гэтай гісторыі. Атрымалася гераічная меладрама з сімвалічным фіналам: нараджаецца дзіця, якое трэба выратаваць дзеля працягу жыцця.

Мне здаецца, гранічная сумленнасць расповеду пра вайну і людзей у неверагодна складаных сітуацыях, калі трэба было выжыць, выяўлялася на першым этапе асэнсавання прозы Быкава, які быў вельмі плённым пісьменнікам, а яго творчасць — шматмерная. Гэта ж выявілася ў тэлевізійных фільмах, у прыватнасці, «Доўгія вёрсты вайны» Аляксандра Карпава-старэйшага. Рэжысёр-франтавік, які ведаў усе падзеі не па расповедах, зняў трылогію, у якой кожная гісторыя праўдзівая, і гэта нядзіўна: Карпаў увасобіў уласныя думкі і адчуванні. Я нядаўна перагледзела фільм: ён успрымаецца актуальна, бо фрагменты могуць сысці за хроніку, за дакументальныя кадры ці не часоў Вялікай Айчыннай вайны. У працы над трылогіяй Карпаў абапіраўся на сцэнарый самога пісьменніка. Тры часткі — гэта экранізацыі трох аповесцяў: «Жураўліны крык», «Атака з ходу» і «На ўзыходзе сонца». Па сутнасці, у іх адлюстраваны тры этапы вайны ад 41-га года да таго моманту, калі для нашых людзей пачалося пераможнае ўзыходжанне. Ідэя ўзыходжання звязана, вядома, з фільмам Ларысы Шэпіцькі. Але гэтая тэма была апрацаваная раней, у тым ліку ў беларускіх фільмах.


*Кадр з фільма «Трэцяя ракета».*

Бо ў тэлефільме «Доўгія вёрсты вайны» адбываецца менавіта ўзыходжанне народа ад прыніжэння, ад прыгнечання, ад адступлення праз наступ да перамогі. Прычым Карпаў гэта паказвае без пафасу. Яго трылогія прасякнутая агульным лейтматывам, ён аб'яднаў яе часткі адным героем — для гэтага абралі ваеннага чалавека, якога іграе Вадзім Якаўлеў. Праз яго перадаецца ўвесь жах пяхоты падчас страшнага адступлення напачатку вайны. Але гэта ўспрыманне вайны радавымі — там няма высокіх генералаў. Зноў тая самая «акопная праўда» Быкава, які адгукнуўся на заклік рэжысёра па стварэнні сцэнарыю. Гэты фільм трэба і можна глядзець сёння, бо ён сумленны. У гэтую ж абойму ўваходзіць больш позні фільм Карпава «Яго батальён» пра Героя Савецкага Саюза, які ратаваў салдат ад бессэнсоўнай гібелі. Я б сказала, што гэта паўтарэнне пройдзенага — «акопнай» гераічнай гісторыі. Але час ужо чакаў іншага падыходу да ваеннай тэмы ў кіно.

**Гутарыла Ларыса ЦІМОШЫК**

*Працяг у наступным нумары*

# Каму карты ў рукі?

**Хочаш даведацца аб паходжанні пэўных назваў, іх сэнсавага значэння, вымаўлення і гучання — без тапанімікі не абысціся. Праўда, наконт гэтага народ мае свае меркаванні. Аднак, хоць ведаць паданні і легенды цікава, думка навукоўцаў больш аўтарытэтная. Гэта тычыцца і пытання паходжання Клецка. Сённяшняй яго назва, вядома, стала не адразу. Паступова трансфармавалася з блізкіх ёй па гучанні: Кльчск, Кльческ, Кльчьсъ, Клечьск.**



*Фота з сайта pixabay.com*

У кнізе Вадзіма Жучкевіча «Краткий топонимический словарь Белоруссии» наконт гэтага такое тлумачэнне: «Современное написание позволяет сблизить данное название с основой клеть (…)». Тут жа даецца адсылка да слова к л е т и щ е. Гэтак называюцца і асобныя вёскі ў Рагачоўскім, Стаўбцоўскім і Кобрынскім раёнах. Таксама і ў некаторых іншых раёнах ёсць блізкія ім па назве: Клецкі, Клетнае. «В основе названий, — сведчыць Вадзім Андрэевіч, — термин клеть — деревянный сруб, прямоугольная постройка, также неотапливаемое помещение избы, иногда складское помещение, амбар; клетица или клетка — небольшая клеть, клетище — место бывшей клети».

Пры гэтым аўтар удакладняе, што «более ранние формы свидетельствуют о других связях». Прынамсі, магчымая сувязь са словам «клечь» — у сэнсе бярозавы гай. Гэты тэрмін згадвае Уладзімір Даль у сваім «Толковом словаре живого великорусского языка». У беларускай мове яго можна напаткаць як дыялектны варыянт у некаторых мясцовасцях. Нельга адмаўляць яму і ў «сваяцтве» са словам «клечанне», а гэта «зелень, которой убирают избу в Троицин день».

Але ў «бярозавым» паходжанні Клецка сумняваецца доктар філалагічных навук Аляксандр Рогалеў. Ён перакананы, што «пытанне аб паходжанні назвы Клецк нельга вырашаць так проста». Яна «не магла ўтварыцца ад слова клець, як, дарэчы, і ад нагаданых дыялектных слоў — рускага клечь і беларускага клечанне». Адштурхоўваючыся ад старажытных найменняў Мінск, Полацк, Віцебск і іншых, навуковец звяртае ўвагу на ўтварэнне іх «з дапамогай суфікса "ск" ад назваў рэчак, на якіх размяшчалася першапачатковае пасяленне». А гэта Мена, Палата, Віцьба.

Даследчык задаецца пытаннем: а ці не існавала некалі рака Клеч ці Клеча? Ды напрошваецца наступнае пытанне — як быць з тым, што Клецк стаіць на рацэ Лані? Далейшыя развагі Аляксандра Рогалева таксама лагічныя: «(…) але вядома і тое, што амаль кожны старажытны горад узнікаў на месцы сутокаў дзвюх рэк». Назву паселішчу давала меншая з іх ці нават ручай. У дадзеным выпадку рачулка Клеч ці Клеча магла да нашых дзён не захавацца.

Аднак «клеч», паводле Вадзіма Жучкевіча, — гэта і бярозавы гай. Атрымліваецца, што трэба пагадзіцца з яго думкай аб менавіта такім паходжанні назвы Клецк. Аляксандр Рогалеў не адмаўляе, «што драбналессе, у тым ліку бярозавыя парасткі, звычайна з'яўляюцца якраз уздоўж берагоў лясных балоцістых рэчак і ручаёў». Нагадвае і пра тое, што спачатку слова «клець» азначала «дом», «жытло», таму дводзіць, што найменні тыпу Клеча трэба ўспрымаць як тыя рэчкі, што працякаюць побач з домам, жытлом. А ўжо назвы рэчак падказалі і назоў паселішчам.

Свае развагі ён завяршае крыху нечакана: «[…] ці не хаваецца ва ўсіх нагаданых геаграфічных назвах нейкае забытае сёння ці запазычанае некалі з моў іншых народаў слова, спрадвечнае значэнне якога пакуль адшукаць немагчыма?» Хоць, калі добра падумаць, нечаканасць гэтая, прабачце за таўталогію, не такая ўжо і нечаканая. Яна вытлумачальная для таго, хто, сам пастаянна знаходзячыся ў пошуку ісціны, і іншым падказвае, што ім неабходна ісці падобным шляхам. А гэта і падказка маладым даследчыкам. Найперш тым, хто апантана працуе, імкнучыся да таго, каб на карце малой радзімы ўсё меней заставалася белых плям.

Магчымы адрас пошукаў нечакана з'явіўся і ў мяне. Паспрыяў гэтаму фільм «Они сражались за Родину». Прыгадалася, якім вялікім поспехам ён некалі карыстаўся. За адзін 1975 год з ім пазнаёміліся больш як 40 мільёнаў гледачоў. Па апытаннях чытачоў часопіса «Советский экран» фільм быў названы найлепшым, а Васіль Шукшын — найлепшым акцёрам года. Стужка была прадстаўлена ў асноўнай праграме Канскага фестывалю. Захацелася зноў пазнаёміцца з ёю. Балазе, зрабіць гэтага нескладана.

Усё як на вайне. На гэта паўплывала ўжо тое, што здымкі праводзіліся на месцы былых баёў. Сапёрам давялося нялёгка. Паўсюдна сустракаліся міны, снарады, якія трэба было абясшкоджваць. Абнаўляліся зарослыя акопы і варонкі. А пасля даводзілася ўсё рабіць так, каб баявыя дзеянні ў фільме былі максімальна набліжаны да часоў Вялікай Айчыннай вайны. Хутар, дзе адбываліся здымкі, і так быў амаль паўразбураны. Тых, хто жыў, адсялілі... А далей усё набліжалася да часоў ваенных.

***Даследчык задаецца пытаннем: а ці не існавала некалі рака Клеч ці Клеча? Ды напрошваецца наступнае пытанне — як быць з тым, што Клецк стаіць на рацэ Лані? Далейшыя развагі Аляксандра Рогалева таксама лагічныя: «(…) але вядома і тое, што амаль кожны старажытны горад узнікаў на месцы сутокаў дзвюх рэк». Назву паселішчу давала меншая з іх ці нават ручай. У дадзеным выпадку рачулка Клеч ці Клеча магла да нашых дзён не захавацца.***

Чытач ужо гатовы запытацца: «А якое дачыненне гэта мае да Клецка?» Хутар, дзе здымаўся фільм «Они сражались за Родину», называўся Мелалогаўскі. Згодна з тамтэйшым тэрытарыяльным падзелам ён адносіцца да Клетскага раёна Валгаградскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Менавіта да Клетскага, а не Клецкага. Цэнтр — станіца Клетская. Тым не менш сугучнасць з Клецкам відавочная. Так што маладым даследчыкам і карты ў рукі.

**Язэп ЛІТВІНОВІЧ**

**з пошты «ЛіМа»**

# Адрасамі знакамітасцяў

**Сёння мы шмат гаворым пра выхаванне маладога чалавека, пра развіццё яго патрыятычных пачуццяў, пра любоў юнакоў і дзяўчат да роднай старонкі. Несумненна, правільныя і надзвычай актуальныя словы… Мне толькі здаецца, што даволі часта губляецца канкрэтыка.**

Што я маю на ўвазе? Маладому чалавеку не хапае ведаў, звязаных менавіта з яго роднымі мясцінамі. Так, лічбавая прастора перапоўнена фактамі і датамі. Але часта і ў Вікіпедыі гэтыя звесткі носяць заблытаны характар, адрозніваюцца сумнеўнай праўдзівасцю, пазбаўлены сістэмнасці. І тым болей лічбавая прастора ў большасці выпадкаў не расказвае пра нешта дробнае, прыватнае, пра малыя паселішчы, пра далучанасць нават знакамітых постацяў да той ці іншай тэрыторыі…

Кніга і толькі кніга павінна адказаць на многія пытанні рэгіёназнаўчага характару. Краязнаўцы, мясцовыя музейшчыкі — першыя і самыя патрыятычныя летапісцы ў перказе падзей, якія звязваюць чалавека з родным краем. На жаль, у кніжных выдавецтвах




краіны сёння не так шмат ініцыятыў, якія б стваралі такога тыпу бібліятэчку патрэбных кніг. Згубіліся розныя вартыя ўвагі кніжныя серыі мінулых гадоў. А штосьці з таго, што мела месца ў колішніх усесаюзных выдавецтвах ці выдавецтвах іншых рэспублік да 1991 года, так і не прыйшло да нас, у Беларусь.

Вось перада мною на стале ляжыць кніга мастацтвазнаўцы Ірыны Васільеўны Паленавай «Ярашэнка ў Пецярбургу». Аўтар расказвае пра аднаго з кіраўнікоў Таварыства перасоўных мастацкіх выставак, стваральніка вядомых палотнішчаў «Качагар», «Вязень», «Курсістка», «Паўсюль жыццё» і іншых, а таксама пра памятныя мясціны Санкт-Пецярбурга — Ленінграда, звязаныя з жыццём і творчасцю мастака. З прадмовы да кнігі: «…працы мастака ўвайшлі ў свядомасць дзясяткаў тысяч людзей як паэтычныя дакументы, якія адлюстроўваюць побыт і погляды дэмакратычнай інтэлігенцыі часін грамадскага пад'ёму сямідзясятых гадоў і надышоўшай затым рэакцыі. Дакладны ў адчуванні эпохі, мастак не ігнараваў драматычных старонак жыцця, але ўвогуле ўспрымаў яго пазітыўна, і гэта заўсёды прыцягвала і будзе прыцягваць да яго сэрцы…»

Разам з даследчыцай чытач (а кніга ў 1983 годзе ў Ленвыдаце выйшла накладам 50 000 экзэмпляраў) мае магчымасць павандраваць па розных адрасах горада на Няве. Чытанне яшчэ і тым цікавае, што дапамагае ажыццявіць своеасаблівае анлайн-падарожжа.

Ведаю, што ў серыі «Выдатныя дзеячы навукі і культуры ў Пецярбургу — Петраградзе — Ленінградзе» выйшлі і іншыя кнігі, прысвечаныя шмат каму з вядомых асоб. Некаторыя давялося чытаць — пра Ганну Ахматаву, Архіпа Куінджы, Сяргея Ясеніна, Аляксандра Блока… Пра гэтых выбітных дзеячаў культуры ёсць і іншыя кнігі, па-за межамі серыі Ленвыдата. Але ж сціплыя памерам зборнічкі, напісаныя, як правіла, лёгка, даступнай мовай, уразілі дэталямі, фактаграфічнасцю, многімі цікавосткамі. І чаму ў нас няма такіх кніг?! Хіба не чыталася б выданне, напрыклад, з такой назвай: «Янка Купала ў Мінску»? Альбо — «Якуб Колас у Мінску»? Упэўнены, што і кніга «Васіль Быкаў у Гродне» займела б свайго чытача. А можа, «Аляксей Пысін у Магілёве» ці «Уладзімір Караткевіч у Мінску»… Хіба ж не ўзнікне пасля прачытання старонак выданняў з такімі назвамі жаданне прайсці адрасамі знакамітых пісьменнікаў?!

Вось толькі хапіла б адвагі айчынным выдаўцам прапанаваць краязнаўцам, даследчыкам гісторыі, публіцыстам напісаць падобныя даследаванні!.. Упэўнены, урокам выхавання любові да роднага стала б кожная такая кніжачка.

**Валерый ПАНАСЮК,**
**г. п. Карэлічы, Гродзенская вобласць**

# Не ўсё могуць князі

**Гэтая песня — настолькі папулярная, што ў многіх на слыху: «Всё могут короли, всё могут короли, и судьбы всей земли вершат они порой, но что ни говори, жениться по любви не может ни один, ни один король». Ды, калі падумаць, у многім праўдзівая. Асабліва, калі кінуць позірк у гісторыю. Не толькі каралі, а і іншыя, хто ўладу меў, заводзячы сем'і, менш за ўсё пра каханне думалі. Калі ж хто-небудзь і асмельваўся парушыць гэтую няпісаную традыцыю, то яго намер своечасова спынялі. Але ж сапраўднаму каханню не скажаш «не». Так, як і ў гэтай гісторыі…**

## Кап'ё — сімвал смеласці

Сярод плямёнаў, якія ў даўнія часы насялялі тэрыторыю Беларусі, былі і драўляне. Жылі яны ў басейне Дняпра, на правым беразе Прыпяці, па цячэнні рэк Убарць, Сцвіга, Цераў і іншых. Вакол — векавыя непраходныя лясы, у іх шмат драўніны. Адсюль і найменне. Міналі стагоддзі, а месца свайго традыцыйнага рассялення яны не пакідалі. Нават трапіўшы ў залежнасць ад Кіева. Даніну выплачвалі своечасова, таму па-ранейшаму на сваёй зямлі заставаліся гаспадарамі. Так працягвалася, пакуль пасад не перайшоў да Ігара.

У драўлян тады правіў Мал. Пасля смерці жонкі ён выхоўваў сына Дабрыню і дачку Малушу. Яе вельмі любіў, таму і назвалі ў яго гонар. Ласкава-памяншальна клікалі Малкай. Бесклапотнае маленства Дабрыні і Малушы працягвалася б і далей, калі б не прагнасць Ігара. Яму падалося, што драўляне плацяць мала даніны. Пабор павялічылі. Ды прагнасць межаў не мае. У 945 годзе яму і гэтага падалося мала. З паўдарогі павярнуў назад, каб здзейсніць яшчэ адзін пабор. Абураныя драўляне забілі яго.

Мал разумеў, што Вольга адпомсціць за гібель свайго мужа. Аднак супрацьстаяць яе войску не мог. Сіла была не на яго баку. Выйсце ўбачыў у тым, каб ажаніцца з ёю. Пасля гэтага хацеў прыбраць да сваіх рук Кіеў і вярнуць заваяваныя землі. Толькі Вольга аказалася хітрэйшай. Яна забіла прысланых сватоў. Смерць напаткала і самога князя Мала. А драўлянская сталіца — горад Іскарасцень — была спалена.

Дабрыню ж і Малушу Вольга пашкадавала. Прыгадала, што зусім нядаўна ў чымсьці гэтакім жа бездапаможным выглядаў і яе сын Святаслаў, хоць і быў ужо кіеўскім князем. Успомніла, як павёў сябе перад тым, як кіяўляне напалі на драўлян. Старэйшыны тады сказалі ёй:

— Іскарасцень будзе пераможаны пры адной умове…

— Што яшчэ за ўмова?

— Сам князь павінен даць знак пачынаць бітву.

Наўрад ці здагадваўся Святаслаў, якая адказная місія ўскладаецца на яго. Усміхнуўся, калі яго пасадзілі на каня і далі кап'ё. Усміхаўся і ледзь трымаючы яго ў сваіх кволых руках. Не ведаў, што рабіць з ім.

— Кідай наперад, — падказала яму Вольга.

З цяжкасцю прыўзняў зброю. Вострым канцом кап'ё ледзь не лягло на галаву каня паміж яго вушэй.

— Вышэй падымай, княжа! — пачуліся галасы.

— Маладзец! — пахваліў яго ваявода Свенельд.

Ад пахвалы твар Святаслава расплыўся ў шырокай усмешцы. Ён з усёй сілы шпурнуў кап'ё. Але штуршок атрымаўся слабым. Кап'ё, праляцеўшы паміж вушэй каня, ударыла яго па назе. Толькі на гэта ніхто не звярнуў асаблівай увагі.

Свенельд гучна крыкнуў:

— Князь пачаў свой бой! Ударым жа, ваяры, услед за ім!

Рука ў Святаслава сапраўды аказалася лёгкай. Іскарасцень быў пераможаны. Потым спалены дашчэнту. Пра няўдалае кіданне кап'я хутка ўсе забыліся. Галоўнае было тое, што перамаглі драўлян. Адна Вольга не забылася. Разумела, што, каб адчуваць сябе ўпэўнена ў абыходжанні са зброяй, сыну трэба яшчэ нямала расці.

## Чужыя сталі сваімі

Позірк Вольгі нечакана сустрэўся з позіркам Дабрыні. Ён глядзеў на яе прама, не адводзячы вачэй. Позірк як быццам працінаў наскрозь. Нібыта кап'ё, кінутае некалі Святаславам. У іншым выпадку абурылася б. Не пашкадавала б таго, хто ў такім малым узросце праяўляе да яе лютую нянавісць. Але менавіта такі чалавек, як гэты Дабрыня, і патрэбны быў ёй. Калі падрасце, не забудзе, хто захаваў яму жыццё. Стане служыць верай і праўдай. Лепшага воіна ў княжацкай дружыне не знойдзеш. Аднак што рабіць з ягонай сястрой?

Забіць дачку Мала рука ў яе таксама не паднялася. Калі ўбачыла, як Малка, зусім малая яшчэ, заліваецца слязьмі, камяк падступіў да горла. Паспела нямала смярцей пабачыць. Аднак захацелася, каб гэтая дзяўчынка засталася жыць. Памкнулася нават пагладзіць яе па галоўцы. Але своечасова спахапілася. Разумела, што гэтага якраз і не трэба рабіць. Акружэнне падобны ўчынак успрыме як праяўленне слабасці. Ёй жа хацелася выглядаць моцнай, валявой.

— Пакіньце дзяцей жывымі! Паедуць са мной у Кіеў! — загадала.

З цягам часу Малуша на многае забылася. Бо нямала вады і ў Прыпяці, і ў Дняпры сплыло з таго моманту, калі Вольга так жорстка расправілася з непакорнымі драўлянамі. Таму і забылася, што ўсё ж ставілія да яе няблага. Дый і да Дабрыні. Выхоўвалі іх разам са Святаславам. Асабліва зблізіўся з ім Дабрыня. Хоць яго памяць захавала многае. Быў жа старэйшы, калі загінуў бацька. Памятаў і тое, як быў спалены Іскарасцень. Аднак глыбока ў душы ўсё ж хаваў непрыязь да княгіні Вольгі. Але чым больш сталеў, тым часцей лавіў сябе на думцы, што жывецца яму не так і кепска. Упэўненасці пабольшала, калі заўважыў, што Святаслаў неабыякавы да яго сястры. Неаднойчы лавіў сябе на думцы: як бы было добра, калі б Малуша стала жонкай князя.



*Умоўны партрэт Святаслава Ігаравіча, XVII ст.*

## Калі жонка — толькі Малка

Упэўненасці пабольшала, калі Малуша стала ключніцай. Як тады казалі — аканомкай. Гэта была вельмі адказная пасада. Той, каго прызначалі на яе, карыстаўся асаблівым даверам. З павагай ставілася да ключніцы і княжацкае акружэнне.

Аднойчы Дабрыня параіў сястры:

— Смялей паводзь сябе са Святаславам.

— Жартаваць вырашыў? — сумелася, чырванеючы.

— Якія жарты? Ён мне казаў, што вы сустракаецеся.

— Ён князь, — уздыхнула Малуша, — а я хто?

— Колькі табе напамінаць! — павысіў голас Дабрыня. — Наш бацька таксама князем быў. Па-ранейшаму не верыш?

— Не веру!

Дабрыня ўжо не ведаў, што і адказаць. Сабраўся ісці, але Малуша спыніла яго:

— Не спяшайся…

— Ты нешта хочаш сказаць? — здзівіўся ён.

— У тое, што я княжацкая дачка, паверу тады толькі...

— Калі? — загарэўся нецярпеннем Дабрыня.

— Як пачую гэта ад аднаго чалавека.

— Нарэшце! — узрадаваўся Дабрыня. — І хто ён, гэты чалавек?

— Князь! —вырвалася ў Малушы.

— Святаслаў даўно ведае, хто быў наш бацька! — ад радасці Дабрыня абняў сястру. — Я папрашу яго, і ён пацвердзіць тое, што я неаднойчы казаў табе.

— Гэтага якраз і не трэба! — заззлавала Малуша.

— Чаго не трэба? — не разумеў Дабрыня.

— Тваёй дапамогі!

— Нічога не разумею.

Дабрыня і на самай справе нічога не разумеў.

— Зразумець нескладана, — голас Малушы крыху памякчэў.

— То адкрый сакрэт, — не цярпелася Дабрыню.

— Дай мне слова, што зробіш так, як я хачу.

— Богам Перуном клянуся, — паспяшаўся запэўніць яе. — Богам Вялесам — таксама. Ніколі не пайду насуперак тваіму жаданню!

— Паверу ў тое, што я — княжацкая дачка, — выпаліла Малуша, — толькі тады, калі гэта скажа сам Святаслаў. Без чыйго-небудзь напамінку…

Дабрыню давялося стрымаць слова. Баяўся, што калі пойдзе насуперак волі сястры, то будзе пакараны і Перуном, і Вялесам. Разумеў таксама, што калі прагаворыцца, то і іншыя багі наўрад ці будуць пасля гэтага спагадлівыя да яго. Не любяць яны, калі чалавек пустазвонствам займаецца. Аднак і неабходнасці напамінаць Святаславу аб размове, што адбылася ў яго з сястрой, не было ніякай. Усё часцей Дабрыню даводзілася бачыць іх з Малушай разам. Значыць, Святаслаў сам і скажа, як да яе адносіцца.

Так і адбылося. Неяк раніцой Малуша па-змоўніцку падміргнула яму.

— Штосьці, Малка, ты вельмі вясёлая? — запытаўся Дабрыня.

— Твая праўда, — адказала Малуша.

Ён адразу зразумеў, што мае на ўвазе.

— А ты яшчэ сумнявалася.

— Прабач, брацік, што не верыла табе, — на твары Малушы свяцілася шчасце. — Абяцаў у жонкі ўзяць.

Толькі рана радавалася Малуша. Калі гэтыя чуткі дайшлі да княгіні, яна месца сабе не знаходзіла. Нарэшце вырашыла пра ўсё даведацца ў самога Святаслава.

— Гэта праўда? — спытала строга.

Святаслаў нават не палічыў патрэбным пацікавіцца, што маці мае на ўвазе.

— Праўда, — адказаў так спакойна, быццам пра гэта казаў ужо неаднойчы.

— У цябе ёсць галава? — Вольга з цяжкасцю стрымлівала сябе, каб не закрычаць.

— Я кахаю яе...

— Каго?! — княгіня перайшла на крык. — Маю ключніцу!

— Княжацкую дачку! — павысіў голас і Святаслаў.

— Якога яшчэ князя?!

— Князя Мала!

Княгіня Вольга нечакана расплакалася:

— Сыночак, я ж падшукала табе дастойную жонку.

Думала, што запытаецца, хто яна. Не запытаўся. Ніяк не зрэагаваў на гэта. Быццам сказанае яго зусім не тычылася.

## Маці настаяла на сваім

Зразумела Вольга, што на сына можна паўздзейнічаць, толькі праявіўшы характар. Настойлівасць паказаўшы. Таму лёгка прыйшла ў сябе. Нібы і не плакала. Вочы, у якіх яшчэ праступалі слёзы, нечакана сталі злымі і жорсткімі:

— Запомні: тваёй жонкай будзе Ільдзіка. Дачка венгерскага князя Такшоня.

— Маёй жонкай будзе Малка! — не менш цвёрда адказаў Святаслаў.

Жонкай яго ўсё ж стала Ільдзіка. Вольга ад свайго намеру не адступілася. Дый мяняць рашэнне, па сутнасці, было позна. З венгерскім дваром ужо вяліся перамовы наконт таго, каб парадніцца. Была атрымана згода, што Ільдзіка выйдзе замуж за Святаслава. Аднак ён, нават ажаніўшыся, не пераставаў сустракацца з Малушай. Гэта скончылася тым, што ў яго нарадзіўся пазашлюбны сын. Яму далі імя Уладзімір.

У Святаслава ўжо былі два законныя спадчыннікі трона — Яраполк і Алег. Але ад Уладзіміра ён не толькі не адмовіўся, а і прызнаў яго афіцыйна. Выхавацелем прызначыў Малушынага брата, а Уладзіміравага дзядзьку Дабрыню. Яму гэта толькі і патрэбна было. Даўно марыў аб вяртанні драўлянскіх земляў, якія належалі яму па праве спадчынніка. З нараджэннем Уладзіміра яго даўняя мара набыла пад сабой аснову. Калі не сам ён, дык яго пляменнік абавязкова павінен стаць валадаром земляў, якія некалі належалі князю Малу.

Святаслаў ужо дзейнічаў самастойна. Небходнасць прыслухоўвацца да голасу маці адпала. Гэта Дабрыню было на руку. Карыстаючыся ў Святаслава вялікім даверам, ён прапанаваў яму будаваць горад Оўруч, у якім бы княжыў Уладзімір. Святаслаў быў не супраць. Несумненна, так бы і адбылося, калі б не ноўгарадцы. Яны былі вольныя самі выбіраць сабе ўладароў. Палічылі, што лепшага князя, чым сын Святаслава і Малушы, не знайсці. Уладзімір пачаў княжыць у Ноўгарадзе.

У 972 годзе князь Святаслаў загінуў каля дняпроўскіх парогаў у баі з печанегамі. Адбылося гэта пасля яго вяртання з Візантыі, дзе заключыў мір з імператарам Іаанам Цымісхіем. Кіеўскі пасад заняў Яраполк Святаславіч. Дзеля дасягнення сваёй мэты забіў роднага брата Алега.

Дабрыня ж бачыў кіеўскім князем толькі свайго пляменніка. Але ні княгіня Вольга, ні Малуша пра гэта ўжо не маглі даведацца. На той час іх не было ў жывых. Вольга яшчэ паспела выслаць Малушу з Кіева. Тая апошнія свае дні дажывала ў сяле Будуцін, што на рацэ Рось.

Дарэчы, паводле адной з версій яна з'яўлялася зусім не дачкой драўлянскага князя Мала. Яе бацькам нібыта быў нейкі Малка Любчанін. Але гэта малаверагодна. Не магла стаць княжацкай ключніцай дзяўчына з народных нізоў. Таму і пераважае думка, што Малуша была ўсё ж дачкой князя Мала. І нарадзілася яна на той тэрыторыі, якая сёння адносіцца да Беларусі.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

## Кветка з літпалетка

# «І нас укрыюць верасы…»



**Назва гэтай расліны паэтычная настолькі, што яе выкарыстоўвалі ў якасці псеўданіма і часта згадвалі ў вершах айчынныя творцы, яна паслужыла найменнем папулярнаму вакальна-інструментальнаму ансамблю і ад яе ўтварылася назва першага восеньскага месяца, — верас.**

Людвіка Войцік (1892—1991) — легендарная асоба ў гісторыі беларускай літаратуры. Дзень яе нараджэння — 30 верасня. Можа, гэта і было адной з прычын, чаму яна стала падпісвацца Зоськай Верас (хаця яшчэ ў 1911 годзе, на самым пачатку пісьменніцкай кар'еры, у газеце «Наша ніва» абразкі яна пазначыла псеўданімам Мірко). Рана пачала цікавіцца раслінным светам, а ў 1924 годзе выступіла аўтарам знакамітага «Беларуска-польска-расейска-лацінскага батанічнага слоўніка», выдадзенага ў Вільні, і брашуры «Гісторыя ўжывання зёлак у лячэнні» (1934).

«Прадмова» да слоўніка з'яўляецца змястоўным артыкулам, дзе Зоська Верас патлумачыла сваю любоў да кветак і зёлак: «…чалавеку цікаваму, знаёмаму з назовамі раслінаў у яго роднай мове і то з назовамі не штучнымі, выдуманымі, а чыстанароднымі, кожная раслінка, кожнае зелейка раскажа не толькі дэталі свайго ўласнага жыцця, гісторыю свайго роду, але ж таксама напомніць аб той ролі, якую яно ірае ў жыцці нашых сялян, у іх медыцыне, чарах і варожбах. Часта адно характэрнае названне раскрые перад нашымі вачыма ўсю паэтычнасць і багатую фантазію нашага народу…»

Мужнасці, нязломнасці гэтай жанчыны мог бы пазайздросціць любы: Зоська Верас вынесла з віленскай турмы «Лукішкі» вершы Міхася Машары (1902—1976) і выдала за свой кошт яго першы зборнік «Малюнкі». Міхась Машара, дарэчы, прасядзеў на «Лукішках» больш чым чатыры гады за ўдзел у нацыянальна-вызваленчай барацьбе. А вось чалавечаму лёсу пісьменніцы можна толькі паспачуваць: першы яе муж Фабіян Шантыр (прынамсі, мужам яна яго называе ў лістах да сяброўкі па перапісцы) у 1918 годзе быў арыштаваны і расстраляны ў 1920-м. Падобная доля напаткала і іх сына Антона Шантыра, які правёў у лагерах дзесяць гадоў без права перапіскі нават з маці, вярнуўся цяжка хворым і неўзабаве памёр.

Надзіва цудоўную песню выконваў калісьці Віктар Вуячыч. У словах яе ўражвае яркі вобраз, здавалася б, сціплай расліны:

*Полымя ружовых верасоў.*
*Я да соснаў, пэўна б, не прыйшоў,*
*Калі б лета сум мой загаіла,*
*Калі б восень зноў не запаліла*
*Полымя ружовых верасоў.*

*Вёсны, вёсны, пералескі…*
*Ва ўспамінах узышлі пралескі.*
*Пад дажджамі восеньскай расы*
*Хай жа расцвітуць зноў верасы.*

Аўтарам гэтых слоў з'яўляецца Іосіф Скурко (1938—1989), хроснік Максіма Танка, таксама родам з вёскі Пількаўшчына Мядзельскага раёна. У 1972 годзе песня «Полымя ружовых верасоў» была прызнана найлепшай песняй на тэрыторыі Савецкага Саюза. Музыку напісаў Ігар Лучанок.

Адметны вобраз Верасовай Жанчыны стварыў Уладзімір Караткевіч у аповесці «Ладдзя Роспачы»:

«— Аднойчы я ўбачыў у палях Верасовую Жанчыну. Тую, што крыкамі палохае людзей, і потым абавязкова нехта пампрэ.

— То ж бо ўсе кажуць, што ты важдаешся з д'яблам.

— Гэта нястрашна пасля некаторых жанчын… Дык вось, у яе былі распатланыя валасы, і крычала яна так, што ў людзей дрыжалі сэрцы. — Гервасій усміхаўся.

— А ты? — спытала Бона.

Галава Вылівахі пяшчотна схілілася.

— А я… пашкадаваў яе, пані матка. Яна была, відаць, прыгожая жанчына. І вось праблукала ўвесь век па верасовых пустках, палохаючы ўсіх жудаснымі воклічамі. Так і не зведала, якія паплавы за Дняпром, якое цёплае сена, як п'яніць віно, як не зразумееш, шэпт гэта ці шолах вярбы пад ветрам. Так і не зведала, як цвіце ружовы глог ля маёй камяніцы… Мне стала шкада яе. Мне шкада ўсіх — такое ўжо ў мяне сэрца».

Верасовая Жанчына сімвалізуе спрадвечны страх чалавека ў пераходны час дня — напрыклад, на змярканні. Напэўна, пісьменнік запазычыў вобраз з еўрапейскага фальклору, бо ў нас не так шмат верасовых пустак.

Цудоўныя радкі, дзе згадваецца верас, ёсць і ў вершы У. Караткевіча «Ты і я» (5 мая 1963 г.):

*Пад дзявятым валам ветразь ніцы,*
*Верас, што агнём абняў пярун,*
*Павуцінка ў пекле навальніцы, —*
*Адкажы на вуха ўладару,*

*Як мне здужаць ураган і вецер,*
*Вечны мой, зацяты, страшны бой?*
*Як мне, моцнаму, пражыць на свеце*
*Без цябе, танюткай і слабой?*

Верш быў надрукаваны ў зборніку «Мая Іліяда» (1969).

Расліна трапіла і ў назву першага і пакуль адзінага паэтычнага зборніка Алеся Спіцына «Цені верасоў» (2001). Верш з вобразам кветкі, па якім аўтар даў загаловак кніжцы, з'яўляецца выдатным узорам патрыятычнай лірыкі, дзе пра любоў да свайго краю сказана сціпла і без пафасу:

* * *

*Світанак каралём панурым*
*Аб'едзе сонныя лясы,*
*Дзе на зямлі маёй пурпурна*
*Квітнеюць летам верасы.*

*Суквецці ў спёку уздухмяняць*
*Салодкі і снатворны пах,*
*Каб мрою абудзіць і памяць,*
*Затанчаць цені на імхах.*

*Старую нагадаюць прагу*
*Пад ціхай засенню бароў*
*Малітваў сведкі, клятваў, скаргаў —*
*Нямыя цені верасоў.*

*І на клінок вайны забытай*
*Адбітак ляжа іх красы,*
*І рог пакліча… І на бітву*
*Дадуць адвагі верасы.*

*І, можа, пырсне зноў з-пад сталі*
*Ці наша, ці чужая кроў, —*
*Яе ад позіркаў схаваюць*
*Нямыя цені верасоў.*

*Мячы, сутычкі, перамогі —*
*Мы тут спачнем ад іх ізноў,*
*На твары белым і знямоглым*
*Затанчаць цені верасоў.*

*І ўжо калі апошні выклік*
*Пальчаткай кінем смерці мы,*
*Дасць Бог — нас родны жвір засыпле*
*І нас укрыюць верасы.*

Верас звычайны *(Calluna vulgaris)* утрымлівае дубільныя рэчывы, мінеральныя солі ды процьму ўсяго іншага карыснага і мае шырокі ўжытак у медыцыне.

**Таша ШПАКОЎСКАЯ**

## зваротная сувязь

# Рыцары і гераклы ды іх прыгоды

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя праекты. Перадача «Адным штрыхом» з вершамі беларускіх аўтараў выходзіць па буднях у 07:20, 13:25 і 18:10. Праграма «Радыёсерыял» гучыць з панядзелка да пятніцы ў 8:45 і 18:45 і прапануе староні аповесці Таісы Бондар «Час, калі нас любілі».

Праграма «Літаратурная анталогія» па буднях у 14:15, 22:30 знаёміць з раманам Уільяма Сомерсета Моэма «Тэатр». У «Радыёбібліятэцы» ў панядзелак — пятніцу ў 11:00, 20:30 слухайце твор Пятра Васючэнкі «Дванаццаць подзвігаў Геракла». У 20:30 па суботах выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі», дзе можна паслухаць апавяданні беларускіх і замежных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» у суботу і нядзелю ў 12:05 і 18:50 прагучаць вершы Пятра Прыходзькі.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» у суботу і нядзелю (пачатак эфіру ў 21:30) складуць дзве часткі радыёверсіі спектакля «Даходнае месца» паводле аднайменнай п'есы Аляксандра Астроўскага.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У гэтыя дні выходзіць твор Наталлі Бучынскай «Рыцар Квых і "жабіны вочкі"». Штовечар а 21:00 для маленькіх прапануецца «Вячэрняя казка».

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў.

У нядзелю радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» пісьменніка, публіцыста Навума Гальпяровіча прапануе сустрэчу з паэтэсай Таццянай Цвіркай. Новы выпуск праекта гэтага аўтара «Літаратура на радыё» прагучыць у чацвер у 08:15 і 13:30.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце і ў сацыяльных сетках.

## ЛіМ каляндар

**6 жніўня** — 85 гадоў з дня нараджэння Ігара Лучанка (1938—2018), беларускага кампазітара, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, народнага артыста Беларусі, народнага артыста СССР.

**6 жніўня** — 65-годдзе святкуе Яўген Грыдзюшка (1958), беларускі гітарыст, педагог, адзін з пачынальнікаў беларускай гітарнай школы.

**8 жніўня** — 90-гадовы юбілей святкуе Ларыса Гусева (1933), беларускі літаратуразнаўца, крытык.

**8 жніўня** — 70-годдзе адзначае Уладзімір Пракапцоў (1953), беларускі мастацтвазнаўца, жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

**9 жніўня** — 130 гадоў з дня нараджэння Васіля Мачульскага (1893—1973), беларускага літаратуразнаўца.

**9 жніўня** — 85 гадоў з дня нараджэння Алы Сямёнавай (Альбіны Іванаўны; 1938—2022), беларускага крытыка, празаіка.

**10 жніўня** — 145 гадоў з дня нараджэння Еўсцігнея Міровіча (сапр. Дунаеў; 1878—1952), беларускага рэжысёра, драматурга, педагога, аднаго са стваральнікаў беларускага савецкага тэатра, народнага артыста Беларусі.

**12 жніўня** — 130 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Ружанцова (1893—1966), беларускага паэта, перакладчыка, мастака, гісторыка, бібліёграфа.

**12 жніўня** — 80-гадовы юбілей святкуе Міхаіл Кавальчук (1943), беларускі рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі.

**Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ**

Калектыў Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі шчыра смуткуе з прычыны смерці Фёдара Канстанцінавіча САЕВІЧА і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім, сябрам і паплечнікам.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі;
прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар
Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Нумар падпісаны ў друк
03.08.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 655

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 1815

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 23031